Установа адукацыі

«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва

Кафедра этналогіі і фальклору

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| _________В.В.Калацэй | __________Н.У.Карчэўская |
| 01 верасня 2017 г. | 27 красавіка 2017 г. |

ВУЧЭБНО-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**ЭТНАГРАФІЯ**

*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Складальнік: Лабачэўская Вольга Аляксандроўна, доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Разгледжана і зацверджана

на пасяджэнні Савета ўніверсітэта ___ ________________ 20___ г.

пратакол № ___

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СКЛАДАЛЬНІК:

*Лабачэўская Вольга Аляксандроўна,* доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

РЕЦЭНЗЕНТЫ:
*кафедра* тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;
*Г.А. Барвенава*, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 20 красавіка 2017 г. № 9);
*саветам факультэта* традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 27 красавіка 2017 г. № 9)
*саветам* установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 23 мая 2017 г. № 9)

Адказны за рэдакцыю: А.У.Рагуля

Адказны за выпуск: В.А. Лабачэўскя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ………………………………………............. | 4 |
| 2. | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………………… | 7 |
| 2.1 | Навучальныя дапаможнікі па дысцыпліне «Этнаграфія»………………. | 7 |
| 2.2 | Канспекты (тэксты лекцый) .........................…....................................... | 8 |
| | Раздзел I. Этналогія. Паняційны апарат этнаграфічнай навукі………….. | 8 |
| | Раздзел II. Этнаграфія Беларусі…………………………………………. | 16 |
| | Раздзел III. Промыслы і рамёствы беларусаў…………………………….. | 38 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………………….. | 60 |
| 3.1 | Вучэбныя выданні, афіцыныйна рэкамендаваныя МА РБ..... ………….. | 60 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ……………………………………......... | 61 |
| 4.1 | Пералік пытанняў да семінарскіх і практычных заняткаў ……………. | 61 |
| | Раздзел I. Этналогія. Паняційны апарат этнаграфічнай навукі………….. | 61 |
| | Раздзел II. Этнаграфія Беларусі…………………………………………. | 63 |
| | Раздзел III. Промыслы і рамёствы беларусаў…………………………….. | 65 |
| 4.2 | Заданні для кантралюемай самастойнай работы і графік яе кантролю… | 69 |
| 4.3 | Пералік пытанняў да экзамену і залікаў ……………………………….. | 73 |
| 4.4 | Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў………………………………………………………………….. | 77 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………............................ | 80 |
| 5.1 | Вучэбная праграма УВА па вучэбнай дысцыпліне …………………....... | 80 |
| 5.2 | Рабочы тэматычны план па дысцыпліне “Этнаграфія”………………….. | 81 |
| 5.3 | Методыкі выкладання дысцыпліны ……………………………………… | 83 |
| 5.4 | Метадычныя рэкамендацыі………………………………………………… | 84 |
| 5.5 | Пералік выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў для вывучэння дысцыпліны……………………………………………………….. | 85 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Этнаграфія” для студэнтаў спецыяльнасці “Народная творчасць (фальклор)” складаецца з трох адносна самастойных частак – “Этналогія”, “Этнаграфія Беларусі” і “Промыслы і рамёствы” і выкладаецца на працягу чатырох вучэбных семестраў на 1 і 2 курсах.

Выкладанне дысцыпліны «Этнаграфія» прадугледжвае сувязь з іншымі дысцыплінамі: «Міфалогія», «Вусная народная творчасць», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Этнасеміётыка».

*Мэта* ВМК– раскрыць асаблівасці фарміравання матэрыяльнай, духоўнай і паводзінавай культуры беларусаў на розных этапах гістарычнага развіцця насельніцтва беларускіх тэрыторый.

*Задачы ВМК*:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды па гісторыі фарміравання беларускага этнасу ў кантэкс¬це гісторыка-культурных сувязей з суседнімі народамі;

– раскрыць патэнцыял этнічнай культуры для этнаэкалогіі беларусаў і для рэвіталізацыі іх нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

– сфарміраваць аналітычную кампетэнцыю даследчыкаў і пераемнікаў (забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці этнаграфічнай спадчыны для мадэлявання ўмоў яе захавання) у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– гісторыю этнакультурнага вывучэння беларусаў;

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгледжаныя ў межах дадзенай дысцыпліны;

– сістэмы класіфікацый народаў свету і іх традыцыйнай матэрыяльнай культуры;

– асаблівасці матэрыяльнай традыцыйнай культуры беларусаў;

– этапы развіцця драўлянага дойлідства Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асноўныя народныя промыслы і рамёствы, тэхналогію іх вырабу і практычнае выкарыстанне;

– асаблівасці традыцыйнага беларускага касцюма згодна з даследаваннямі М. Раманюка;

– асаблівасці этнічнага абрадавага і паўсядзённага харчавання;

– пісьмовыя крыніцы па этнаграфіі;

*умець:*

– праводзіць самастойныя палявыя даследаванні матэрыяльнай культуры з мэтай фіксацыі лакальна-рэгіянальных асаблівасцей;

– адрозніваць народныя строі розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, вызначаць іх асаблівасці, колеравую гаму, арнаментальныя кампазіцыі;

– выкарыстоўваць у паўсядзённым побыце асобныя народныя рамёствы;

*валодаць:*

– сучасным тэрміналагічным слоўнікам навуковай і народнай тэрміналогіі па беларусазнаўстве і этнаграфіі;

– метадамі фіксацыі, вывучэння, архівавання і выдання помнікаў этнаграфіі;

– прыёмамі дакументавання фальклорных адзінак.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага фальклору і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– метад этнаграфічнага даследавання;

– метад уключанага назірання.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Этнаграфія» ўсяго адведзена 270 гадзін, з якіх 140 гадзін – аўдыторныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняткі (114 гадзін – лекцыі, 26 гадзін – семінары).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамен.

ВМК (ЭУМК) ўключае канспекты лекцый, тэматыку семінарскіх заняткаў, пералік пытанняў для семінарскіх заняткаў, заданні для самастойнай кантраляванай працы спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, пытанні залікаў і іспытаў па ўсіх названых раздзелах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Навучальныя дапаможнікі па дысцыпліне «Этнаграфія»

1. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ / [Т. А. Навагродскі і інш.] Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2009. – 335 с.
2. Лобач, У.А. Этналогія : вучэб. метад. комплекс для студэнтаў спец. 1-21 03 01 “Гісторыя” / У.А. Лобач. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 132 с.
3. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі : вучэб. метад. комплекс для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 “Гісторыя”, 1-02 01 02 “Гісторыя. Замежная мова” / У.А. Лобач. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 328 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2 Канспекты (тэксты лекцый)

## Раздзел І. ЭТНАЛОГІЯ

## Тэма І. Этналогія як навука. Асноўныя паняцці этналогіі

### Лекцыя 1. Уводіны. Прадмет і задачы этналогіі.

*Пытанні:*

1. Прадмет і задачы этналогіі
2. Станаўленне этналогіі як навукі.
3. Метады этнаграфічнай навукі

Вызначэнне этналогіі. Месца этналогіі ў сістэме навук. Традыцыі назваў і разумення зместу этналогіі ў розных навуковых школах і краінах. Суадносіны этналогіі, этнаграфіі і антрапалогіі: заходняя і айчынная традыцыя. Аб'ект і прадмет этналогіі. Погляды сучасных вучоных на прадмет этналогіі. Актуальнасць этналогіі. Роля этналагічных ведаў ў светапогляднай, палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай і інш. сферах. Гуманістычны патэнцыял этналогіі.

Праблема крыніц у этналогіі. Разуменне этналогіі ў айчыннай традыцыі як гістарычнай навукі і спецыфіка этналагічных крыніц. Віды крыніц.

Метады этналогіі. Методыка палявой этнаграфіі. Этнаграфічная экспедыцыя. Палявая этыка. Палявы інструментарый даследчыка. Палявы сшытак, палявы дзённік, тэхнічныя сродкі фіксацыі і апрацоўкі матэрыялаў. Спецыфіка этналагічнай інтэрпрэтацыі пісьмовых, музейных і інш. крыніц.

Разуменне культуры ў этналогіі. Дэзаксіялагічны падыход у этналогіі. Этнацэнтрызм. Паняцці "этнічная культура", "традыцыйная культура". Культуры архаічныя, традыцыйныя і мадэрнізаваныя. Тэорыі мадэрнізацыі.

### Лекцыя 2. Катэгорыя этнасу і яго складнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Пытанні:*

1. Паняцці «этнас» і «этнічнасць».

2. Структура этнасу.

3. Вывучэнне этнічнасці ў сучаснай навуцы.

Паняцце этнасу. Кампаненты і прыкметы этнасу. Гістарычныя тыпы этнасу. Асноўныя падыходы да паняцця этнас – прымардыялісцкі, канструктывісцкі і інструменталісцкі. Асноўныя тэорыі этнасу. Паняцце этнічнасці.

Этнічныя працэсы. Эвалюцыйныя і трансфармацыйныя працэсы. Унутры-, між- і надэтнічныя працэсы. Працэсы раздзялення і аб'яднання. Асіміляцыя, кансалідацыя, міксацыя і інтэграцыя.

Этнічная ідэнтычнасць. Кампаненты, узроўні і тыпы ідэнтычнасці.

**Лекцыя 3. Антрапагенез і этнагенез, класіфікацыі народаў.**

*Птытанні:*

1. Этнагенез і яго асноўныя фактары.

2. Метады даследавання этнагенезу.

3. Этнагенез і антрапагенезу. Канцэпцыя этнагенезу Л.Н. Гумілёва

4. Геаграфічная, этналінгвістычнае, гаспадарча-культурная кваліфікацыя народаў.

Этнічная гісторыя. Суадносіны этнагенезу і этнічнай гісторыі. Этнічная гісторыя Зямлі. Канцэпцыя этнагенезу Л.Н. Гумілёва.

Геаграфічная, этналінгвістычнае, гаспадарча-культурная кваліфікацыя народаў

Арганізацыя этналагічнай навукі. Навуковыя цэнтры Беларусі і буйнейшыя навуковыя цэнтры свету. Этналогія ў беларускіх вну.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Этнаграфічныя музеі Беларусі і свету. Скансены. Этналагічная перыёдыка. Энцыклапедыі і шматтомныя выданні этналагічных прац. Этналогія і Internet.

### Тэма 2. Станаўленне этналогіі і этналагічнай праблематыкі

### Лецыя 4. Станаўленне этналогіі як навукі. Этналагічныя школы і тэорыі.

*Пытанні:*

1. Збіранне этнаграфічных звестак у Антычнасці, Сярэднявеччы і часы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.
2. Асветнікі XVIII ст. пра народазнаўства.
3. Асноўныя напрамкі этнаграфіі і этнічнай антрапалогіі XIX-XX стст.

Уяўленні аб этнічным у першабытным грамадстве. Назапашванне этналагічных ведаў у старажытнасці і сярэднія вякі. Падарожжы і Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Роля каланіяльнай экспансіі XV-XX стст. у актуалізацыі этналагічнай веды. Асветніцтва і этналагічная праблематыка. Канцэпцыя шчаслівага дзікуна.

Рамантызм як культурная сітуацыя і абуджэнне інтарэсу да народнай культуры. Міфалагічная школа. Уплыў мовазнаўчых ідэй Ё.Гердэра, В.Гумбальта.

Сацыяльныя і навуковыя перадумовы. Этналагічныя таварыствы.

Эвалюцыянізм у этналогіі. Л.Морган, Э.Тайлар і інш. Ідэі дыфузіянізму ў этналогіі. Ф.Ратцаль, Ф.Грэбнер і інш. Сацыялагічная школа. Фрэйдызм у этналогіі.

Гістарычныя ўмовы пачатку XX ст. і іх уплыў на развіццё этналогіі – першая сусветная вайна і крызіс каланіялізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Лекцыя 5. Этналагічныя школы і тэорыі.**

*Пытанні:*

1. Структуралізм.
2. Функцыяналізм.
3. Нэаэвалюцыянізм.
4. Савецкая школа этнаграфіі.

Структуралізм і функцыяналізм. Б.Маліноўскі, А.Рэдкліф-Браун. К.Леві-Строс. Амерыканская этналогія: Школа Ф.Бааса, псіхалагічная канцэпцыя. А.Кардынер, Р.Бенедыкт і інш. М.Мід. Рэлятывізм. М.Херскавіц. Постмадэрнісцкія канцэпцыі.

Неаэвалюцыянізм. Школа “культурнага матэрыялізму”. Л.Уайт, Дж.Сцюард, М.Харыс і інш.

Савецкія этналагічныя тэорыі. М.Кавалеўскі, С.Шыракагораў, М.Чэбаксараў, Ю.Брамлей, С.Токараў, Л.Гумілёў, С.Аруцюнаў і інш.

**Тэма 3. Агульная характарыстыка народаў свету**

**Лекцыя 6. Класіфікацыі народаў свету.**

*Пытанні:*

1. Класіфікацыі ў этнаграфіі.
2. Чатыры асноўныя класіфікацыі народаў свету.

Геаграфічныя класіфікацыі. Варыятыўнасць вылучэння рэгіёнаў. Паняцце айкумены. Абарыгеннае, аўтахтоннае, карэннае і прышлае насельніцтва. Рассяленне чалавецтва па Зямлі ў гістарычнай рэтраспекцыі.

Этнагаспадарчыя класіфікацыі. Вылучэнне гаспадарчых комплексаў у народаў свету ў савецкай этнаграфіі. Паняцце гаспадарча-культурнага тыпу.

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце тыпу (стратэгіі) жыццезабеспячэння ў заходняй навуковай традыцыі. Агульная характарыстыка комплексу культуры грамадстваў паляўнічых і збіральнікаў, ручных землеробаў, пастаралістаў, аграрных грамадстваў, грамадстваў з індустрыяльнай вытворчасцю прадуктаў харчавання.

Лінгвістычныя класіфікацыі. Погляды на ўзнікненне чалавечай мовы. Фанетычная, марфалагічная і генеалагічная класіфікацыі этнасаў. значэнне генеалагічнай класіфікацыі ў этналогіі. Моўныя сем'і народаў свету. Ізаляваныя мовы.

Антрапалагічная класіфікацыя. Расавыя прыкметы. Погляды на ўзнікненне расававых адрозненняў. Характарыстыка вялікіх расаў. Паняцце малой расы. Расізм у гістарычных і палітычных канцэпцыях: сацыял-дарвінізм, еўгеніка і інш. Сучасны расізм.

**Лекцыя 7. Агульны агляд народаў свету. Народы Аўстраліі. Народы Акіяніі.**

*Пытанні:*

1. Народы Аўстраліі.
2. Народы Акеаніі.

Этнічная гісторыя, антрапалагічны тып, мова, асаблівасці гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, сацыяльнай арганізацыі. Этнасы папуа. Антрапалагічны тып і моўная сітуацыя. Гаспадарча-культурная спецыфіка. Феномен “біг мэнства” і рэгіянальныя вераванні. Этнічныя супольнасці Меланэзіі. Гаспадарча-культурная характарыстыка. Асаблівасці сацыяльнай арганізацыі і рэлігійных вераванняў. Уяўленні пра “мана” і культ “карга”. Супольнасці Палінэзіі. Асаблівасці гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сацыяльная арганізацыя. Касты. Дзяржаўныя утварэнні. Культ правадыроў. Этнічныя супольнасці Мікранэзіі. Асаблівасці гаспадаркі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сацыяльная арганізацыя.Жаночыя саюзы.

## Лекцыя 8. Агульны агляд народаў свету. Народы Азіі.

*Пытанні:*

1. Народы Заходняй Азіі.
2. Народы Паўднёвай Азіі. Класіфікацыі ў этнаграфіі.
3. Чатыры асноўныя класіфікацыі народаў свету.
4. Народы Усходняй і Паўднёвай Азіі.

Гісторыка-культурныя рэгіёны ў Азіі. Этнасы Заходняй Азіі. Этнічны склад насельніцтва. Лінгвістычная і антрапалагічная сітуацыя. Традыцыйная матэрыяльная культура і гаспадарчыя заняткі. Адметнасць промыслаў і раместваў рэгіену. Іслам і яго уплыў на сацыяльнае жыцце і культуру. Спецыфіка сацыяльнага жыцця і культуры яўрэяў. Сістэма забаронаў. Інстытут равіната. Традыцыйныя абрады і святы яўрэяў. Этнічныя супольнасці Сярэдняй Азіі і Казахстана. Этнічны склад і моўная характарыстыка насельніцтва. Асаблівасці этнічнай гісторыі. Традыцыйныя формы гаспадарчых заняткаў. Асаблівасці матэрыяльнай культуры і сацыяльнай арганізацыі. Духоўная культура і традыцыйнае мастацтва.

Этнічныя супольнасці Паўднёвай Азіі. Кароткі агляд этнічнай гісторыі. Этна-лінгвістычная і антрапалагічная сітуацыя. Перэферыйныя гаспадарча-культурныя тыпы: паляўнічыя і збіральнікі, ручныя земляробы, жывелаводы. Ворыўнае земляробства: тэхналогія і культуры. Адметнасць рамесніцкіх традыцый. Рэлігійная культура і яе ўплыў на сацыяльныя адносіны і сямейнае жыцце. Паходжанне індуізму. Брахманізм і каставы лад. Ідэя рэінкарнацыі і канцэпцыя “кармы”. Асноўныя прынцыпы джаінізму і будызму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Народы Паўднева-Усходняй Азіі. Этнічная, антрапалагічная і лінгвістычная класіфікацыя. Гаспадарча-культурныя тыпы. Паляўнічыя і збіральнікі (кубу, семангі). Ручныя земляробы (сеноі, даякі). Ворыўныя земляробы (в'еты, кхмеры). Спецыфіка матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Этнічныя супольнасці Цэнтральнай і Усходняй Азіі. Этнічная, антрапалагічная і лінгвістычная сітуацыя. Феномен іерагліфічнай пісьмовасці і яе роля ў развіцці культуры рэгіена. Гаспадарча-культурныя тыпы. Айны – аселыя рыбаловы і збіральнікі. Айнскі антрапалагічны тып; асаблівасці гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры.Жывелаводы Цэнтральнай Азіі. Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай кульутры. Рольныя земляробы. Кітайцы, карэйцы, японцы. Тэхналогія земляробства і ірыгацыі. Спецыфіка рэлігійных сістэм (даасізм, канфуцыянства, сінтаізм, дзэн-будызм).

Этнічныя супольнасці Сібіры. Лінгвістычная і антрапалагічная сітуацыя. Спецыфіка традыцыйных гаспадарчых заняткаў, матэрыяльнай культуры і рэлігійных ўяўленняў. Змены ў жыцці народаў Сібіры ў сувязі з яе каланізацыяй.

**Лекцыя 9. Агульны агляд народаў свету. Народы Афрыкі. Народы Амерыкі.**

*Пытанні:*

1. Народы Афыкі.
2. Народы Амерыкі.

Антрапалагічны склад насельніцтва Афрыкі. Негрыльскі, эфіопскі і бушменскі расавы тыпы. Лінгвістычная сітуацыя. Гісторыка-культурныя рэгіены. Этнічная гісторыя: кароткі агляд.

Гаспадарча-культурныя тыпы Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі. Паляўнічыя і збіральнікі. Асаблівасці гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сацыяльная арганізацыя і рэлігійныя ўяўленні. Жывёлаводы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фульбэ, туарэгі, масаі. Матэрыяльная культура. Каставы лад. Становішча жанчыны. Духоўная кульутра і рэлігія. Ручныя земляробы трапічных лясоў і саван. Тэхналогія земляробства і асаблівасці матэрыяльнай культуры. Сацыяльная структура. Таемныя мужчынскія і жаночыя саюзы. Духоўная культура і рэлігійныя ўяўленні. Этнасы Паўночнай і Паўночна-Усходняй Афрыкі. Асаблівасці гаспадаркі і матэрыяльнай культуры.

Праблема першапачатковага засялення Амерыкі. Моўная і антрапалагічная сітуацыя да Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Гаспадарча-культурныя тыпы Паўночнай Амерыкі:

1. Арктычныя паляўнічыя і рыбаловы (эскімосы і алеуты), асаблівасці гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, рэлігійныя ўяўленні.

2. Збіральнікі Каліфорніі. Сацыяльная арганізацыя, матэрыяльная і духоўная культура.

3. Паляўнічыя лясной зоны. Гаспадарка і матэрыяльная культура. Грамадская арганізацыя (племя, род, фратрыя) і рэлігійныя ўяўленні.

4. Паляўнічыя прэрый. Племенная арганізацыя, асаблівасці гаспадаркі і духоўнай культуры. Фарміраванне ваеннай дэмакратыі.

5. Аселыя рыбаловы паўночна-заходняга ўзбярэжжа. Спецыфіка экалагічных умоў і яе ўплыў на гаспадарку і сацыяльную арганізацыю. Развіцце абмену.

6. Ручныя земляробы Паўночнай Амерыкі. Спецыфіка гаспадаркі і сацыяльнай арганізацыі. Авачыра іракезаў. Рэлігійныя ўяўленні. Гаспадарча-культурныя тыпы Паўдневай Амерыкі.

**Лекцыя 10. Агульны агляд народаў свету. Народы Еўропы.**

*Пытанні:*

1. Кластфікацыя народаў Еўропы.
2. Народы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.
3. Народы Паўночнай Еўропы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класіфікацыя этнічных супольнасцяў Еўропы: антрапалагічная, лінгвістычная, гаспадарча-культурная. Гісторыка-культурныя вобласці. Этнічныя супольнасці Заходняй Еўропы. Этнічныя праблемы Францыі, Італіі, Іспаніі, Вялікабрытаніі, Бельгіі, югаслаўскі крызіс. Вопыт вырашэння міжэтнічных праблем у Швейцарыі, Даніі, Фінляндыі.

Раманскія народы Зах.Еўропы. Традыцыйная матэрыяльная і духоўная культутра. Германскія народы. Гістарычны лес кельтаў. Фальклор і музычнае мастацтва. Сучаснае кельцкае адраджэнне.

Этнічныя супольнасці Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблема паходжання, моўная і антрапалагічная характарыстыка. Асаблівасці традыцыйных гаспадарчых заняткаў і матэрыяльнай культуры. Духоўная культура: традыцыйныя святы і абрады, фальклор, харэаграфія і музычнае мастацтва.

Этнічныя супольнасці Еўрапейскай часткі Расіі. Рускія. Дыялектны і гісторыка-этнаграфічны падзел. Паўночная, паўднёвая і сярэдня-руская зоны. Суб’этнічныя і этнаграфічныя групы. Традыцыйная культутра: матэрыяльна-гаспадарчы і духоўны аспект.

Сучасныя этна-нацыянальныя працэсы ў Еўропе: праблемы культурнай рэгіянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах глабалізацыі і магчымыя ўляхі іх вырашэння

## Раздзел II. Этнаграфія Беларусі

### Тэма 4. Этнагенез і этнічная гісторыя беларусаў

*Пытанні:*

1. Старажытная гісторыя Беларусі і структура этнаграфічнай культуры беларусаў.

2 Станаўленне і развіццё беларускай народнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3 Кансалідацыя і самавызначэнне беларусаў як народа і нацыі.

*Літаратура:*

Беларусы: Этнаграфія. Дэмаграфія. Дыяспара. Канфесіі: Атлас. Мн.,1996. — 49 с.

Загорульский Э.М. Древняя история Белоруссии. – Мн., 1974.

Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь. Краіна і людзі. – Мн.: Беларусь, 1996.— 208 с.

Перыяды старажытнай гісторыі Беларусі: даіндаеўрапейскі, балтыйскі і славянскі. Усходнія славяне IX – X стст. Полацкае княства. Кіеўская Русь. Насельніцтва Беларусі ў складзе ВКЛ. Фарміраванне старажытнабеларускай мовы, асноўных рыс традыцыйнай беларускай культуры. Шырокае распаўсюджанне этнонімаў “русіны”, “літвіны”. Этнічная гісторыя беларусаў у XVII – XVIII стст. Этнічныя працэсы ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Працэс паланізацыі ў першай трэці XIX ст. Зараджэнне беларускай нацыянальнай ідэі. Назва “Беларусь” і этнонім “беларусы”. Палітыка русіфікацыі ў другой палове XIX ст. Працэсы кансалідацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Беларускі этнас у межах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР). Палітыка беларусізацыі 20-х гг XX ст. Этнічныя працэсы на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.). Асаблівасці этнічнага жыцця Беларусі ў 40-я гг. XX ст. Этнічныя працэсы ў 50-80-я гг. XX ст. Другая хваля беларусізацыі ў XX ст. Беларускі этнас ва ўмовах самастойнай Рэспублікі Беларусь. Сучасныя этнічныя працэсы ў Беларусі.

**1. Старажытная гісторыя Беларусі**

**14**-м стагоддзем датуюць этап фарміравання беларускай народнасці, на якім скончылася наша старажытная гісторыя: ў тагачасовых пісьмовых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крыніцах Вялікага Княства Літоўскага – фанэтыка і марфалогія беларускай мовы. Па мове мы ўжо тады з'яўляліся беларусамі. Але культура Беларусі, каб стаць культурай беларускай народнасці, прайшла праз 3 этапы living рознага этнічнага напаўнення. Эдуард Загарульскі прапануе наступную іх храналогію.

Этапы старажытнай гісторыі Беларусі

| Даіндаеўрапейскі (мезаліт-неаліт) | Балтыйскі (эпоха метала) | Славянскі (сярэднявечча) |
|---|---|---|
| XX (пдз. Беларусі) ці X (пн. Беларусі) тыстыс. да н.э. – мяжа III/II тыстыс. да н.э. | Мяжа III/II тыстыс. да н.э.– 6-10 стст. н.э. | 6-10 стст.– XIV ст. |

Беларусь была заселена ў палеаліце: ў XX тыс. да н.э. – паўднёвыя раёны; у X тыс. да н.э. – паўночныя, якія доўга былі пад ледніком. Паляўнічыя плямёны мезаліту Беларусі *(IX-V тыс. да н.э.)* з'яўляліся этнаграфічнымі групамі, якія мелі ўласную мову, тэрыторыю і агульныя рысы культуры. Этнічная мапа захавалася і ў неаліце *(IV-III тыс. да н.э.)* пры росквіце суполак жывёлаводаў і земляробаў *Старой Еўропы*. Пытанне этнавызначэння палеажыхароў Беларусі спрэчнае, можна зваць іх ***палеаеўрапейцы*** ці ***стараеўрапейцы***. Яны мовілі на неіндаеўрапейскіх гаворках. Дакладна да ***фіна-ўграў*** дапасоўваюць мігрантаў на беларускія тэрыторыі ў IV-III тыс. да н.э. Носьбіты індаеўрапейскіх гаворак – ***балты*** – засялілі Беларусь толькі ў эпоху метала – з міграцыямі качэўнікаў-стэпавікоў і арыефанізацыей Старой Еўропы на мяжы III/II тыстыс. да н.э. Плямёны ж ***славянаў*** разсяліліся тут яшчэ пазней, пасля *Вялікага перасялення народаў*: у 6-7 стст. – ў паўднёвай Беларусі, у 10-11 – ў паўночнай.

Структура паходжання этнаграфічнай культуры беларусаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Элементы этнаграфічнай культуры беларусаў | Адбіткі этапаў старажытнай гісторыі Беларусі | | |
|---|---|---|---|
| | **даіндаеўрапейскага 'стараеўрапейскі' (мезаліт, неаліт)** | **балтыйскага (эпоха метала)** | **славянскага (сярэднявечча)** |
| • жывая этнічная мова | гідраніміка (назвы рэк) паўночнай, заходней і цэнтральнай Беларусі | асноўныя фанемы – 5/6 беларускіх словаў маюць балцкія карані | формаўтваральючая структура: адна з 7 славянскіх моў |
| • сімволіка тра-дыцыйнага дойлідства (арганізацыя жыллёвай прасторы) | па́левыя паселішчы; буйныя вёскі аседлых земляробаў з сядзібамі, палеткамі; мегаліты і культавыя камяні | хутарная забудова; функцыі і назвы па-кояў і гаспадарчых пабудоў; вільчакі на даху; каваныя крыжы | першыя добра ўмацаваныя гарады; сакральнасць ростаняў; «чырвоны кут» хатаў |
| • традыцыйны арнамент (графічныя і пластычныя сімвалы) | ромб, спіраль, расліна: сімволіка, знітаваная з матрыярхальнымі культамі і земляроб-ствам; комплекс «зя-мля – вялікая маці» | монахромнасць ар-наменту, яго геаме-трычнасць; шнура-ваны і штрыхаваны арнамент на кераміцы; салярныя крыжы | поліхромнасць ар-наменту, яго рас-ліннасць; зааморфныя матывы; комплекс «нябесны бацька» |
| • этнічная кінэтыка і праксеміка (сістэма характэрных жэстаў) | цесныя ўзаемадачынен-ні ў супольнасці ў час святаў; дамінаванне жанчын у гаспадарча-земляробчых рытуалах | стрыманасць рухаў; адносна вялікая «ген-дэрная дыстанцыя камунікацыі» ў будзённыя дні | дамінаванне мужчын у грамадскіх і сямейных рытуалах |
| • традыцыйны каляндар (звычайна ён перадае закадзіраванае ўспрыняцце светапарадку) | святы «жаночага» месяцава-сонечнага календара; земляробчыя святы; святы , прымеркаваныя да 2-х сонцаваротаў | агульная «мужчын-ская» структурная арганізацыя (з асновай «Сонечным кры-жом»); яго асноўныя святочныя комплексы | апошняя рэдакцыя назваў асноўных святаў, іх кампраміс з царкоўнай культурай |
| • традыцыйныя спевы і харэаграфія | ангемітоніка; рэфрэны песень Купалля «Лыгу!» і талакі «Рана!»; песні жніва; карагодная традыцыя | агульныя (за выклю-чэннем фанетыкі мо-вы) святочна-абрада-выя комплексы: вялі-кодны,юраўскі,жніўн | жанр песень-духоўных вершаў; шмат з традыцыйна- |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | ы | побытавых танцаў |
| • магія | галашэнні пры ініцыяцыях; калектыўныя родавыя пахаванні роўных па маёмасці; «поза эмбрыёна» нябожчыкаў | індывідуальныя пахаванні воінаў-алігархаў і вершнікаў у курганах; крэмацыя нябожчыкаў | замовы з маркіроўкай цэнтру свету на всп.Руген˜; усходняя арыенціроўка нябожчыкаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. Станаўленне і развіццё беларускай народнасці

Земляробчае насельніцтва беларускіх земляў доўгі час стварала большасць насельніцтва ВКЛ, і менавіта на старабеларускай мове (склаўшайся пад уплывам славянскага пераклада Біблії Кірылам Салунскім), але – лацінскімі літарамі, быў напісан Статут ВКЛ, вялося ў княстве справаводства. У той час нашы продкі звалі сябе “русіны”, “ліцьвіны”, што адлюстроўвала іх балта-славянскае паходжанне і культуру. Акрамя беларусаў-ліцьвінаў (сярод іх былі і язычнікі, і хрысціяне з вёсак і гарадоў) у ВКЛ была шмат іншых народнасцей: язычнікі латышы-латгалы і літоўцы-прусы і жамойты (яны пераважалі ў княскім і ваенным саслоўі), запрошаныя (па лягендзе князям Вітаўтам у XIV ст.) як ваяры, кніжнікі і камерсанты мусульмане-татары, юдаісты-габрэі, неба- і вогнепаклоннікі караімы, каталікі-манахі Ордэна Св. Францыска Асізкага. Афіцыйны дзяржаўны язычніцкі культ вайдэлотаў начале з Крыве пры двары Вялікіх князёў і наяўнасць вольна існуючых побач з праваслаўем і каталіцызмам нехрысціянскіх канфесій па-фарысейску апраўдвала ваяўнічую агрэсію заходняга каталіцызма, які натравіў на гарады і вёскі ВКЛ крыжакоў. Каб пазбегнуць поўнага этнацыду (пасля некалькіх стагоддзеў крывавых войнаў з крыжакамі XII-XIV ст. у выніку чаго была вынішчана цэлая балцкая народнасць – прусы) адбылася афіцыйная хрысціянізацыя ВКЛ: шлюб ахрэшчанага Вялікага князя Ул.Ягайлы з каралевай Польшчы Ядвігай () і стварэнне беларуска-польска-украінскай дзяржавы – Рэчы Паспалітай (). Дэ-

юрэ з'яўляючыся хрысціянскай канстытуцыйнай манархіяй, Рэч Паспаліта доўгі час захоўвала суверынітэт свайго насельніцтва і ад Маскоўскай дзяржавы, і ад дзяржаў Заходняй Еўропы.

### 3. Кансалідацыя і самавызначэнне беларусаў як народа і нацыі

Этнічная гісторыя беларусаў у XVII – XVIII стст. спрыяла фарміраванню іх як нацыі, бо ў складзе Рэчы Паспалітай т.зв. "літоўскія" землі (фактычна – беларускія, бо літоўцаў тады збольшага звалі "жамойты", "летувісы") мелі пэўную аўтаномію. Этнічныя працэсы ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. перыядычна падпадалі то пад русіфікацыю, то пад паланізацыю. Пасля падзела Рэчы Паспалітай пачалася русіфікацыя, працэс паланізацыі меў месца то ў першай трэці XIX ст., пад уплывам напалеонаўскіх войнаў, то напачатку XX ст., калі значная частка Беларусі ўвайшла ў Польшчу. Зараджэнне беларускай нацыянальнай ідэі мела месца ў XIX ст., тады ж пачалі актыўна ўваходзіць у навуковы і публічны абарот назва "Беларусь" і этнонім "беларусы". Адбыліся працэсы кансалідацыі на тэрыторыі Беларусі ў межах Беларускай Народнай Рэспублікі (1918г.) і ў межах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР). Распачылася палітыка беларусізацыі 20-х гг XX ст. Этнічныя працэсы на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) былі пад ціскам паланізацыі. Пасля Другой Сусветнай вайны Беларусь стала членам ААН (спачатку – як рэспубліка СССР), была прызнана на міжнароднай арэне. Другая хваля беларусізацыі пачалася пасля 1991 г., калі Беларусь атрымала суверэнітэт. Беларускі этнас ва ўмовах самастойнай Рэспублікі Беларусь стаў мець многія прыкметы тытульнага, але сучасныя этнічныя працэсы ў Беларусі "па інэрцыі", крыху тармазяцца.

## Тэма 5. Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне Беларусі

*Пытанні:*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: крытэрыі і прынцыпы размежавання.

2. Асаблівасці субкультур гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў.

*Літаратура:*

*Цітоў В.С.* Гісторыка-этнаграфічны рэгіён // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. – Мн.: БелСЭ, 1989.— С.153.

*Цітоў В.С.* Этнаграфічная спадчына: Беларусь. Краіна і людзі. – Мн.: Беларусь, 1996.— 208 с.

*Раманюк М.* Беларускае народнае адзенне: Фотаальбом. - Мн.: Беларусь, 1981.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**1. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: крытэрыі і прынцыпы размежавання**

Неаднароднасць культурнага ландшафту. Багацце і разнастайнасць беларускай традыцыйнай мастацкай культуры. Адаптаванасць народнай культуры, побыту і гаспадарчай дзейнасці да мясцовага прыродна-геаграфічнага ландшафту, гістарычных умоў развіцця. Лакальна-рэгіянальныя традыцыі. Палітра фарбаў нацыянальных строяў у залежнасці ад гісторыка-культурных рэгіёнаў.

Тое, што звычайна завуць «этнаграфічная культура Беларусі», часам – «народная культура Беларусі» – перадусім лад жыцця вёсак і хутароў міжрэччаў Бярэзіны, Прыпяці, Дзвіны, Нёману, які вывучалі і фіксавалі ў сваіх працах фалькларысты і этнографы XIX – XX стст. Яны рупліва апісвалі м а т э р ы я л ь н у ю к у л ь т у р у (*аддзене, прадметы побыту і прылады працы*), к у л ь т у р у м ы с л е н н я (*міфы і ўяўленні пра паходжанне элементаў наваколля і сусвету ўвогуле*) і к у л ь т у р у п а в о д з і н (*гаворкі,*

*шлюбы і пахаванні, каляндарныя святы, гаспадарчую дзейнасць*) жыхароў Беларусі. Працэс фіксацыі доўжыцца і зараз.

Згодна «культурнай антрапалогіі» – англамоўнаму аналагу этнаграфіі, «культура» – агульнапрынятыя формы арганізацыі мыслення і паводзін. Напрацягу гісторыі Беларусі людзі, якія жылі на яе зямлі, думалі і паводзілі сябе па-featureознаму. Нейкія формы мыслення і паводзін, якімі яны карысталіся, зніклі з ужытку, некаторыя рупліва захоўваюцца дагэтуль. Такое спадкаемства – з'ява невыпадковая і сведчыць, што ў гэтым выпадку мы маем справу з традыцыяй – формамі культуры, якія (з прычыны іх нейкай *бясспрэчнай каштоўнасці для людзей*) нашы продкі лічылі мэтазгодным захоўваць.

Традыцыйная культура беларусаў як сістэма – арыгінальная цэласная з'ява. Аднак, праз уласныя багацце і разнастайнасць, яна мае лакальныя асаблівасці на поўначы і поўдні, захадзе і ўсходзе. Аналіз і параўнанне розных праяў традыцыйнай культуры дазволіў у XIX-XX стст. вылучыць на тэрыторыі Беларусі шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Назвы некаторых з іх узгадваюцца з 12-13 стст. (Палессе ў Іпацьеўскім летапісы), маюць этымалагічныя і этнакультурныя карані ў перыядах старажытнай гісторыі Беларусі (Palá, Pelyŝo – літ. балоцісты лес, вялікае балота).

<table>
<tr><td colspan="7">Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Падняпроўе</td><td colspan="2">Палессе</td><td rowspan="2">Цэнтральная Беларусь</td><td rowspan="2">Падзвінне (Паазер'е)</td><td rowspan="2">Панямонне</td></tr>
<tr><td>Усходняе</td><td>Заходняе</td></tr>
<tr><td colspan="7">падзяляюцца на наступныя лакальныя раёны ці падрэгіёны</td></tr>
<tr><td>левабярэжнае<br>правябярэжнае</td><td>Мазыршчына<br>Тураўшчына<br>Прыпяцкі раён</td><td>Пінўшчына<br>Загароддзе<br>Падляшша</td><td>Бярэзінскі,<br>Слуцка-Нясвіжскі,<br>Мінскі раёны</td><td>паўночна-ўсходняе,<br>паўднёва-заходняе</td><td>левабярэжнае<br>правябярэжнае</td></tr>
<tr><td colspan="7">прыкладна адпавядаюць вобласцям</td></tr>
<tr><td>Магілёўская</td><td>Гомельская</td><td>Брэсцкая</td><td>Мінская</td><td>Віцебская</td><td>Гродзенская</td></tr>
</table>

Часцяком сучасны адміністрацыйны падзел не супадае з этнаграфічным. Так (па меркаваннях асобных навукоўцаў-этнолагаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Салігорскі і Любанскі раёны Мінскай вобласці па пэўных адзнаках традыцыйнай культуры – усходнепалескія; Камянецкі раён Брэсцкай – панямонскі; Гомельскі раён – падняпроўскі і г.д.

Лічаць, што на рэгіянальную разнастайнасць і размежаванне народнай культуры Беларусі паўплывалі: межы басейнаў вялікіх рачных сістэм, характар адаптацыі (побыту і гаспадарчай дзейнасці) тубыльцаў да асаблівасцей мясцовага прыродна-геаграфічнага ландшафту; гістарычныя ўмовы развіцця паселішчаў.

## Тэма 6. Асаблівасці рассялення і тыпы паселішчаў беларусаў

*Пытанні:*

1.Фізіка-геаграфічныя ўмовы ландшафту і рассяленне па беларускіх тэрыторыях.

2.Асноўныя тыпы руральных паселішчаў на Беларусі.

3.Гарады і іх роля ў нацыянальным развіцці беларусаў.

*Літаратура:*

Беларусы. Т.2. Дойлідства. – Мн.: Тэхналогія, 1997. —390 с.

Музей старажытнабеларускай культуры: Дапаможнік для наведвальнікаў/ Пад рэд. В.Ф. Шматава. – Мн.: Беларуская навука, 1998.— С.3 – 120, 200 – 235.

Этническая экология: теория и практика. М., 1991.

### 1.Фізіка-геаграфічныя ўмовы ландшафту і рассяленне па беларускіх тэрыторыях.

“Сцэнар” жыцця і смерці кожнай народнасці адбываецца ў пэўным прыродным (“матчыным”) ландшафце. Яго лёс (паводле Льва Гумілёва)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шчыльна “прышпілены” да лёсу этнасу. Этнас пачынае выкарыстоўваць рэсурсы свайго “матчынага” ландшафту рупліва і ашчадна, потым нерацыянальна і па-драпежніцку. Існуе неабходнасць (асабліва на пераломных момантах развіцця грамадства) узважанай і падрабязнай пераацэнкі традыцыйнай адаптацыі да ландшафту. Навыкі ашчаднага карыстання прыроднымі рэсурсамі акумулююцца ў традыцыных асяродках і Гумілёў перасцярагаў ад даручэння кантролю за тэрыторыяй інародцам. Даследчыкі К.П.Іванаў і К.Б.Клокаў звярталі ўвагу ў дзяржаўным прыродакарыстанні на неабходнасць захавання пры планаванні і вядзенні гаспадаркі этнаэкалагічных ведаў кожнага народа.

Залежнасць ад аграрнага ладу жыцця, руральнай культуры паўплывала на асаблівасці рассялення і тыпы паселішчаў беларусаў, якія дапамагалі нашаму народу адаптавацца да ландшафту. Выбар месцаў жытла вызначаўся рассяленнем у накірунках буйных водных артэрыяў, што даюць ваду для гаспадаркі. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі пераважна носяць назвы буйных рэк – Падзвінне, Падняпроўе, Панямонне.

Паўднёва-ўсходнія, раўнінныя Падняпроўе і Палессе прыстасаваныя да земляробства, маюць урадлівыя глебы, цёплы клімат і засяляліся рана (нават з XX тыс. да н.э.). У іх ад неаліту (земляробства з’явілася тут у V-IV тыс. да н.э.) і дагэтуль высокая плотнасць насельніцтва і кампактнае рассяленне. Для гаспадаркі поўдня былі дастатковы невялікія зямельныя надзелы. Дысперсны (рассеяны) характар рассялення ўласцівы для больш халоднага і небагатага на глебы ўзгоркавага паўночнага захаду (Падзвіння і Панямоння).

## 2.Асноўныя тыпы руральных паселішчаў на Беларусі

Дамінуючыя тыпы руральных паселішчаў на Падняпроўі і Палессі – вёскі, сёлы, слабады – да нядаўняга часу налічвалі па некалькі сотняў двароў, хаты ў іх месціліся шчыльна. У гэтых рэгіёнах спрадвеку і дагэтуль высокая плотнасць насельніцтва і кампактнае рассяленне. Кампактнасць абумоўлена тым, што для вырабу неабходнай для жыццезабеспячэння мясцовай асобнай гаспадаркі колькасці прадуктаў і сыравіны былі дастатковы невялікія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўрадлівыя зямельныя надзелы. У вялікіх плошчах для гаспадаркі адной сялянскай сям'і тут не было патрэбы аб'ектыўна – кампактны тып рассялення ў паселішчах паўднёвай Беларусі падтрымліваў неабходны для мясцовага этнаэкалагічнага балансу лад жыцця.

Сяло і слабада – дамінуючыя тыпы паселішчаў поўдня Беларусі, мадыфікацыі вёскі. Сяло (слова ўзгадваецца ў "Аповесці мінулых часоў") – цэнтр вотчыны ці маёнтка, дзе жыў пан, была царква, рынак і карчма. "Слабада" – некалі назва паселішчаў, жыхары якіх часова (на 2 ці 12 год) вызваляліся ад феадальных падаткаў. Пазней слабадой сталі звацца паселішчы рамеснікаў пры гарадах. Адрозніваюць скучаную, лінейную, вулічную формы планіроўкі вёскі.

Дысперсны (рассеяны) характар рассялення характэрны для Падзвіння і Панямоння. Тут дамінавалі такія тыпы паселішчаў, як хутар, фальварак і засценак. Самазабеспячэнне (адаптацыя) тут патрабуе больш буйных плошчаў, гаспадаркі і хаты кожнага роду, сям'і знаходзяцца на значнай адлегласці. Хутар – адасобленая гаспадарка (хата, гаспадарчыя пабудовы, надзел зямлі) сялянскай сям'і, якая выйшла з абшчыны. Фальварак – дробнае (да 5 двароў, з палямі, агародамі і сенажацямі, часам з кузьняй і млынам) паселішча, якое забяспечвала харчаваннем панскі двор. Засценак (назва адрэзкаў ворнай ці сенажатнай зямлі на краі вялікага поля) – дробнае паселішча арандатараў (хата, гаспадарчыя пабудовы, надзел зямлі) пераважна шляхецкага паходжання ("засцянковая шляхта").

**3.Гарады і іх роля ў нацыянальным развіцці беларусаў.**

Пераходным тыпам ад сельскага да гарадскога паселішча з'яўлялася мястэчка – адносна буйное паселішча (культавыя пабудовы, рынак, карчма), жыхары якога займаліся рамёствамі, гандлем, але і вялі прысядзібную гаспадарку. Вялікая роля ў нацыянальным развіцці беларусаў, складанні прадумоў іх дзяржаўнасці і унітарнасці іх краіны належыць гарадам. Без гарадскога ладу жыцця беларусы не былі б здольны інтэгравацца ў эканамічныя ўмовы капіталізму, сацыялізму, індустрыяльнага грамадства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Збольшага гарады ўзніклі на месцах гандлёвых факторый скандынаваў IX ст., потым функцыянавалі як адміністратыўна-культурныя цэнтры княжастваў, ваеводстваў, губерній. Культура іх была шчыльна знітавана з цэнтральна- і ўсходнееўрапейскім тыпам гарадской культуры. У XIV-1/2 XX стст. пераважную колькасць насельніцтва складаў небеларускі этнічны элемент (габрэі, дээтнізаваныя чынавенства, клірыкі і вайскоўцы), таму гарадская культура развівалася ў пэўнай ступені “паралельна” з руральнай – каранёвай.

## Тэма 7. Традыцыйны грамадскі і сямейны побыт

*Пытанні:*

1. Грамадскі лад жыцця руральных асяродкаў Беларусі.
2. Грамадскія інстытуты і нормы сацыяльных адносін беларусаў.
3. Беларуская сям’я як сацыяльны інстытут.
4. Сістэмы сваяцва беларусаў

*Літаратура:*

*Беларусы. Т.5.* Сям’я. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 375 с.

*Беларусы. Т.6.* Грамадскія традыцыі. – Мінск : Бел. навука, 2002.

*Музей* старажытнабеларускай культуры: Дапамож. для наведвальнікаў/ Пад рэд. В.Ф. Шматава. – Мн.: Беларуская навука, 1998.— С.3 – 120, 200 – 235.

*Этническая* экология: теория и практика. М., 1991.

### 1. Грамадскі лад жыцця руральных асяродкаў Беларусі.

Грамадскі лад жыцця руральных асяродкаў Беларусі ад неаліту (часоў з’яўлення земляробства) заснаваны на абшчыннай форме гаспадаркі. У неалітычнай Старой Еўропе абшчына складалася з крэўных сваякоў і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарызавалася калектыўнымі вытворчасцю і ўласнасцю на сродкі вытворчасці; сацыяльнай роўнасцю яе чальцоў. Гістарычны працэс прывёў да змены родавай, сваяцкай абшчыны на суседскую, якая была характэрна для большасці руральных асяродкаў еўрапейскіх краін ужо ў Антычнасці і Сярэднявеччы. Суседская абшчына аседлых земляробаў з поўным ці частковым самакіраваннем, калектыўным валоданнем зямлёй, традыцыйнай паводзіннай культурай (заснаванай на перайманні ладу жыцця продкаў) доўгі час з’яўлялася асновай еўрапейскай цывілізацыі. Структурная арганізацыя абшчыннага жыцця моцна паўплывала на характар этнаграфічнай культуры беларусаў, паколькі да XX стагоддзя вясковы, земляробчы лад жыцця ў Беларусі статыстычна дамінаваў.

**2. Грамадскія інстытуты і нормы сацыяльных адносін беларусаў.**

На Беларусі суседская абшчына называлася *грамадой*. Складалася яна з аднаго ці некалькіх паселішчаў, жыхары якіх сумесна валодалі ворнай зямлёй, сенакосамі, навакольным лесам і прыроднымі рэсурсамі. Грамада мела органы самакіравання (вясковы сход), выбарных асоб (стараста, лаўнікі, дзесяцкія). Існаваў абшчынны суд (Копны суд) для вырашэння спрэчных пытанняў і падтрымання парадку. Абшчына дапамагала суполкам земляробаў аптымальна ўпісацца ў ландшафт, назапашвала і перадавала паміж пакаленнямі інфармацыю пра традыцыі, якія забяспечвалі самааднаўленне этнасу.

Адносіны ў абшчыне рэгламентаваліся грамадскай думкай і звычаёвым правам, якое часта падмацоўвалася дзяржаўным правам. Да галоўных абшчынных звычаяў і абрадаў беларусаў адносяцца наступныя. Талака (сумеснае выкананне сельскагаспадарчых работ). Бонда (пачастунак свежынай і іншымі прадуктамі гаспадаркі сваякоў і суседзяў). Сябрына (сумеснае карыстанне сенажаццю, пчоламі).

Сваю еднасць, належнасць да адзінага народа, агульнага ўпарадкаванага ладу жыцця чальцы грамады сцвярджалі захаваннем традыцыі. А менавіта: рэгулярным удзелам у вячорках, масавых ігрышчах,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калядаванні, валачобніцтве, абрадах купальскай ночы, юраўскім і траецкім святах, талоках і іншых каляндарна-вытворчых абрадах. Асабліва важнымі для самавызначэння супольнасці, магічнага (па ўяўленнях носьбітаў традыцыі) забеспячэння стабільнага ладу жыцця былі святы ўшанавання продкаў (Дзяды, Радаўніца). Для рэкрэацыі, адпачынку, эмацыянальнай разгрузкі ў час святаў існавала карнавальная культура: маскіраванне, абрадавае пераапрананне, жартоўныя гульні. Руральныя традыцыі нагэтулькі глыбока ўкаранены ў свядомасць беларусаў, што не знікаюць і ў XXI ст., пры панаванні гарадскога ладу жыцця, заснаванага на урбаністычных каштоўнасцях – мабільнасці, адрыву ад каранёў, касмапалітызму і глабалізацыі культуры.

**3. Беларуская сям'я як сацыяльны інстытут.**

Сям'я як сацыяльны інстытут – заўсёды неад'емная частка любой грамадскай сістэмы, паколькі праз сямейныя адносіны, істытут шлюбу грамадства ўпарадкоўвае адносіны паміж паламі і атрымлівае сваіх новых чальцоў – маладое пакаленне. Для славян у сярэднявеччы была характэрна т.зв. калектыўная *сям'я-задруга* (сербск. kuca, kuca zadruzna) – калі жанатыя сыны вялі агульную гаспадарку пад кіраўніцтвам бацькі. Для этнаграфічных беларусаў характэрна ўжо т.зв. *нуклеарная* сям'я – муж, жонка і іх дзеці.

Главой сям'і лічыўся муж. Становішча жанчыны ў беларускай сям'і, па звестках этнографаў характарызавалася падпарадкаванасцю мужу і яго крэўным сваякам (свёкру і свякрусе), з якімі трэба была жыць, пакуль маладая сям'я не аддзялялася. Нават калі маладыя жылі пры сям'і бацькі, ім была забяспечана пэўная аўтаномія – па магчымасці асобная хата, ці камора для спальнага месца; у іх асабістыя узаемаадносіны бацькі адкрыта не мяшаліся. Маладая звычайна стымулявала мужа хутчэй аддзяляцца – тады, нават у выпадку смерці мужа, яна мела права жыць у яго хаце і браць да сябе ці дачкі прымака. Акрамя біялагічных бацькоў на Беларусі існаваў інстытут сацыяльных бацькоў – т.зв. прымацтва. Пытанні спадкаемаства маёмасці ад



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваякоў, шлюбаў і разводаў у традыцыйнай суполцы рэгулявала сямейнае звычаёвае права. Права спадкаемства беларусаў этнографы характарызуюць як “заблытанае і складанае”, але галоўнае ў ім – каб зямлю спадкаваў той, хто мог яе апрацоўваць.

Шлюб лічыўся ў вясковых асяродках абавязковым, паколькі аднаму “падняць” сям’ю было амаль немагчыма. Часам шлюбны лёс дзяцей вырашалі бацькі без іх згоды. Шлюбны ўзрост па дакументах XIX ст. афіцыйна пачынаўся з 18 год, аднак часцяком аддавалі замуж і жанілі значна раней, нават з 13-гадовага ўзросту. Розніца паміж маладымі звычайна была 3-4 гады (малады старэйшы за маладую). Царкоўны шлюб лічыўся абавязковым. Існавалі спецыяльныя звычаі і абрады, звязаныя з разводам мужа і жонкі.

Вясельны абрад дзяліўся на тры ўмоўныя часткі: перадвясельная частка, уласна вяселле і паслявясельная частка. Падрыхтоўчы перыяд вяселля. Сватанне. Заручыны. Дзявоцкі вечар. Каравайны абрад. Вяселле. Вясельныя чыны. Пярэзвы.

Радзінным звычаям і абрадам надавалася вялікае значэнне. Вялікім шанаваннем карысталася бабка – павітуха, якая прымала роды і пераразала пупавіну немаўляці. Сам гэты ўрачысты момант па-рознаму абстаўляўся ў розных рэгіёнах. Існавала спецыяльная перадродавая абраднасць, калі, па традыцыйных уяўленнях “праграмаваўся” лёс дзіцёнка, ці пра яго можна была даведацца. На Радзіны запрашаліся сваякі і суседзі, музыкі з муз. інструментамі, спявалі спецыяльныя песні пра бабку, кума і куму. Хрышчэнне дзіцяці ў царкве канталявалі абраныя бацькамі кум і кума – хросныя бацькі.

Пахавальныя звычаі і абрады беларусаў у найбольш архаічнай частцы (напр. у галашэннях) маюць перакрыжаванні нават з архаічнымі абрадамі фіна-ўграў. На памінкі запрашалі суседзяў і сваякоў, накрывалі спецыяльны стол з абрадавай ежай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**4. Сістэмы сваяцва беларусаў**

Сістэма называння сваякоў і крэўных – дакладны індыкатар этнагенезу і культурнай гісторыі народа. Звычайна яе даследуць у межах культурнай антрапалогіі; у беларускай этнаграфіі і фальклярыстыцы яна пакуль не распрацавана. Бясспрэчна, што назвы сваякоў беларусаў маюць шмат агульнага з літоўскімі: сын - sunus, дачушка - dukrele, тата - tete, швагір - svogris, братавая - broliene  і г.д. Для вызначэння тыпалогіі сістэм сваяцтва будуюць спецыяльныя схемы, куды ўпісваецца, як звярталіся да маці, бацькі, стрыечанага брата, сына бацькі (*брат*), сына сына (*унук*), брата жонкі (*швагір*) і г.д. Згодна такому аналізу, у беларусаў сістэма называння сваякоў адносіцца да *эскімоскага* тыпу (як і ў іншых еўрапейскіх народаў).

**Тэма 8. Традыцыйная сістэма харчавання**

*Пытанні:*

1. Ежа як частка этнічнай культуры
2.Трад.спосабы апрацоўкі прадуктаў
3. Характар харчавання беларусаў
4.Традыцыйныя напоі

*Літаратура:*

Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 478 с.

Беларусы. Т.5. Сям’я. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 375 с.

Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі. – Мінск : Бел. навука, 2002.

Літоўская гаспадыня. – Мінск, 1992.

Зайкоўскі Э., Тычка Г. Старажытная беларуская кухня. – Мінск,  1999.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1. Ежа як частка этнічнай культуры

Характар ежы і харчавання чалавека вызначаецца перадусім накіраванасцю гаспадаркі яго этнасу. Паколькі земляробства – асноўны заняткак беларусаў ад неаліту да ХХ ст., менавіта раслінная ежа для беларусаў спрадвечная, а жывёльная (малочныя і мясныя стравы) традыцыйна займалі значна меншае месца ў харчаванні. На сучасны асартымент прадуктаў, спосабы іх прыгатавання і ўжывання паўплывала гістарычная эвалюцыя беларускай кухні – з’яўляліся новыя прадукты харчавання, зараз увогуле сталі шырока ўжывацца стравы іншых народаў. Аднак многія нацыянальныя стравы дагэтуль у шырокім побыце. Народная кулінáрыя беларусаў – адбітак асаблівасцяў іх грамадскага і сямейнага побыту. Так значнае месца ў ёй займаюць абрадавыя стравы і абрадавае печыва – ежа спецыяльна прыгатаваная для каляндарных і сямейных рытуалаў. Ежа, якая не з’яўлялася рытуальнай, але здаўна характэрна для мясцовага этнаграфічнага побыту, завецца традыцыйнай. Час прыёму ежы залежыў ад пачатку і заканчэння сельскагаспадарчых работ. Асартымент харчавання – ад сезоннасці.

2. Характар харчавання беларусаў

Значнае месца ў харчаванні займалі дзікарослыя расліны (шчаўе, цыбуля лугавая, часнок палявы, крапіва, лебяда), ягады і грыбы.  Адным з галоўных прадуктаў харчавання была гародніна – рэпа, рэдзька, цыбуля, часнок, гарох, боб, капуста, буракі, морква, агуркі. Найбольш старажытны від раслiннай ежы – каша. Варылі яе з абтоўчанага цэлага ці пасечанага у крупы ці памолатага ў муку зерня. Кашу з цэльнага ячменю ці пшаніцы – куццю, груцу, гушчу – гатавалі пераважна як абрадавую (на куццю, радзіны, памінкі, Дзяды). Крупяную (традыцыйную) кашу варылі з проса і аўса, ячных і грэцкіх круп. Гатавалі з малаком, салам, часам з мясам і каўбасой. Рэдкія мучныя цестападобныя стравы ўжывалі ў пост. Іх па характару прыгатавання адрозніваюць як квашаныя, няквашаныя, з соладу.  Квашаныя – кулага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кваша; няквашаныя – кулеш, калатуша, саламаха, лямешка; з соладу – саладуха, путра. З аўсянай мукі гатавалі талакно, жур, кісель. Рэдкія мучныя стравы беларусаў – зацірка, галушкі. Вельмі папулярныя бліны пяклі з жытняй, пшанічнай, грэцкай, ячнай мукі. Пяклі іх раніцай на снеданне, бралі з сабой у дарогу, у поле. Жытні і пшанічны хлеб часам пяклі з рознымі напаўніцелямі-дабаўкамі – бульбай, буракамі. Працэс заквасці і пячэння хлеба адносна працяглы, таму, калі не паспявалі, пяклі скавароднік (не падайшоўшы ў дзяжы хлеб) або праснак, корж з прэснага цеста на сываратцы. З XVIII ст. распаўсюдзілася культура прыгатавання і спажывання бульбы, якая стала штодзённай сялянскай ежай – "другім хлебам". Яе, чышчаную і ў лупінах варылі, пяклі, смажылі. З дранай бульбы рабілі дранікі, бабку, з тоўчанай – камы, з пакрышанай – булён. Налічваюць да 200 беларускіх страў з бульбы. Найбольш вядомыя – клёцкі і калдуны. Малако елі халодным, гатаваным, але пераважна – кіслым. Малочны сырадой здаўна лічыўся лекавым сродкам. З мяса ўжывалі свіное мяса, бараніну, мяса свойскіх птушак, радзей – мяса кароў і цялят. Мяса вала (быка, на якім аралі) не елі.

**3. Традыцыйныя спосабы апрацоўкі прадуктаў**

З гародніны сырымі елі рэпу, рэдзьку, агуркі, моркву, цыбулю, часнок. Гарох і боб парылі і пражылі; капусту, буракі, агуркі квасілі і салілі; рэпу, моркву парылі і пяклі. Традыцыйныя спосабы захоўвання прадуктаў – сушэнне, квашэнне; пазней – саленне. Рыбу (уюноў), грыбы, садавіну сушылі ў печах. Буйную рыбу, мяса, сушылі на паветры, пазней – капцілі. Хлеб звычайна выпякалі вялікімі (па 4 – 6 кг.) боханамі, круглымі ці прадаўгаватымі. Звалі іх буханы, букаты, куліды. Пяклі на чэрані, падсцілаючы пад яго свежае капуснае, дубовае ці яваровае лісце, аер. Буханкі абглажвалі вадой, укачвалі мукой (паляніца, пірагі). Рэзаў (кроіў) хлеб на лусты ці скібы бацька, першы кавалак зваўся акраец ці акрайчык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для заквашання малака не ўжывалі і не ўжываюць спецыяльных заквасак – яно кісне само. На тварог кіслае малако адтопліваюць у печы, заліваюць у спецыяльны палатняны клінок, з якога сцякае сываратка. Тварог у клінку завязваюць, кладуць паміж дошкамі пад камень (гнёт), праз пэўны час атрымліваецца сыр. Яго спажываюць свежым, у пост сушылі, або залівалі ў дзежцы растопленым маслам (масленіца, брынза). Даўнейшы спосаб гатавання масла – праз адагрэў смятаны, пазней яго сталі збіваць (калаціць) у глінянай пасудзіне, потым у спецыяльных бойках. Смятану збіраюць з кіслага малака або з салодкага (якое пастаяла ў халодным месцы). Мяса захоўвалі ў свіным страўніку (коўбіку). Сала салілі з прыправамі. Тлушч з авечак, бараноў спажывалі толькі ператопленым (лой), з гусей, качак, курэй вытаплівалі смалец. Са свіных вантроб рабілі вантрабянку (сальцісон), з крыві – крывянку. У той дзень, калі калолі кабана (звычайна напярэдадні Васілля), гаспадары налажвалі са свежыны багатую вячэру – пагалоўшчыну ці верашчаку. На святы пяклі часткі свіной тушы, цяляці, часам цэлыя кумпякі або парася. Мяса перад гэтым трымалі ў расоле з прыправай, перад выпечкай абмазвалі житнім цестам.

Для большасці рэгіёнаў традыцыйна была характэрна 3 ці 4-разовае харчаванне. На снеданне варылі бульбу, пяклі бліны, яешню. Поўдзень ці абед былі а 12-14 гадзіне. На першае елі боршч з салам, мясам ці грыбамі, на другое – кашу, камы ці інш.страву з бульбы. На заканчэнне абеду елі малочны крупнік ці булён, запівалі квасам, кампотам ці кіслым малаком. Паміж абедам і вячэрай, “як сонца зверне” палуднавалі, падвячорквалі. На вячэру звычайна варылі нейкую свежую страву (бульбу, булён), пілі малако.

Вясна была самай галоднай парой і з прычыны заканчэння запасаў, і з прычыны царкоўных пастоў (увогуле ў гаду каля 200 дзён забароны мясной і малочнай ежы). У летняй ежы пераважала свежая гародніна. Восень і зіма былі больш багатыя на хлеб, крупы, мяса, назапашаную гародніну.

**4. Традыцыйныя напоі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Квас (хлебны, дзежны) страдаўні кісла-салодкі напой. Квас пілі, на ім гатавалі гарачыя і халодныя рэдкія стравы. Акрамя хлебнага квас рабілі з бярозавага (бярозавік) і кляновага (кляновік) соку ў бочках з дабаўкай ячменнага соладу і мёду. На зіму квас рабілі з брусніц і журавін. На Палессі квасам называюць адвар і настой з сухіх груш і яблыкаў.

Піва. Месца, дзе варылі піва (гналі гарэлку) звалі бровар ці вінакурня. На Беларусі бровары пры корчмах і сядзібах вядомы з 16 стагоддзя. У бровар уваходзілі саладоўня з сушыльняй, варыўня.

Віно. Узгадваецца ў валачобных песнях. Існуе меркаванне, што беларусы мелі вопыт вінадзелія, але паколькі ў нашых шыротах вінаград не выспявае да неабходнага для вырабу якаснага напоя кансістэнцыі, то віно было барвянога-зялёнага колеру, не зусім якаснае, што паступова звяло яго вытворчасць на не. Вінаград і іншыя ягадывыкарыстоўвалі для гатавання разнастайных налівак, настоеных на гарэлцы і спірце.

Мёд. Як алкагольныя напоі на Беларусі з Сярэднявечча выкарыстоўваліся ферменціраванныя перабрадзіўшыя водныя растворы пчалинага мёду. Больш пазнейшая гарэлка выраблялася шляхам перагону рэчываў бражэння зерня. У вясковых гаспадарках пашырылася на Беларусі з 18-19 стст.

У народных песнях з напояў найчасцей узгадваецца піва. Мёд, віно, гарэлка – значна радзей.

**Тэма 9. Этнічныя меншасці Беларусі**

*Пытанні:*

1. Этнічны склад насельніцтва Беларусі XX ст.
2.Міжэтнічныя адносіны на Беларусі.
3. Славянскія этнічныя меншасці.
4.Неславянскія этнічныя меншасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура:*

Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 478 с.

Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі. – Мн.: Бел. навука, 2002.

Шахотько, Л.П. Социальная демография. Переписи населения: методология, методика, результаты: пособие / Л.П.Шахотько. – Минск: Бестпринт, 2005.

**1. Этнічны склад насельніцтва Беларусі XX ст.**

Сёння на тэрыторыі Беларусі пражываюць прадстаўнікі каля 100 народнасцей. Па перапісу 1989 года небеларусы складалі 22,2% насельніцтва краіны

Этнічны склад насельніцтва Беларусі ў 1989 г.

| **Этнічная прыналежнасць** | **Колькасць** | |
|---|---|---|
| | **тыс.чал.** | **%** |
| Беларусы | 7 897 | 77.8 |
| Расіяне | 1 341 | 13.2 |
| Палякі | 417 | 4.1 |
| Украінцы | 290 | 2.9 |
| Яўрэі | 112 | 1.1 |
| Іншыя | 71 | 0.9 |

За 10 гадоў, паміж 1989 і 1999 гадамі, колькасць небеларусаў паменшылася да 18,8 %, а беларусамі сталі лічыць сабе яшчэ амаль 3% насельніцтва краіны. Таму, пры ўсіх хібах і недакладнасцях працэсу беларусізацыі 1990-х гадоў, трэба адзначыць, што ён меў ўплыў на этнічную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самаідэнтыфікацыю, і, у канчатковым сэнсе, на этнічную структуру насельніцтва краіны.

Этнічны склад насельніцтва Беларусі ў 1999 г.

| Этнічная прыналежнасць | Колькасць | |
|---|---|---|
| | тыс.чал. | % |
| беларусы | 8 159 | 81.2 |
| расіяне | 1 142 | 11.4 |
| палякі | 396 | 3.9 |
| украінцы | 237 | 2.4 |
| Яўрэі | 28 | 0.2 |
| Іншыя | 80 | 0.8 |

**2.Міжэтнічныя адносіны на Беларусі.**

Пакольկі ў такіх формах, як у былой Югаславіі, Грузіі, Малдове, Карабаху, міжэтнічных канфліктаў перыяду «параду суверэнітэтаў» у Беларусі, як у незалежнай унітарнай дзяржаве ніколі не было, можна сказаць, што прадстаўнікі разнастайных этнічных груп паспяхова існуюць у нас у агульным асяродку абітання. Гэта лічаць паказчыкам гарманічнасці міжэтнічных адносін. Да канца XX стагоддзя, увогуле, ва урбаністычных асяродках панавала небеларуская культура, што было абумоўлена этнічнай структурай насельніцтва гарадоў, дзе беларусы складалі меншасць. Аднак, праз асветніцкую дзейнасць прадстаўнікоў культуры тытульнага этнасу краіны і функцыяванне самых розных устаноў культуры напрацягу двух стагоддзяў, апошнім часам відавочна адчуванне беларусамі самакаштоўнасці і маштабу ўласнай культуры.

Сярод найбольш буйных этнічных меншасцей Беларусі называюць наступных: славянскія – рускія, палякі, украінцы; неславянскія – літоўцы, яўрэі, татары, цыганы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3. Славянскія этнічныя меншасці.**

*Рускія.* Міграцыі рускіх на тэрыторыю Беларусі. Стараверы на Беларусі. Павелічэнне рускай этнічнай групы ў выніку асіміляцыйных працэсаў. *Палякі.* Гісторыя беларуска-польскага ўзаемадзеяння. Праблема паланізацыі беларусаў праз каталіцтва. Польская культура на Беларусі. Сучасная статыстыка беларускіх палякаў. *Украінцы.* Праблема этнічнай мяжы паміж беларускім і украінскім этнасамі. Палессе як пераходная зона. Кампактныя пасяленні украінцаў на поўдні Беларусі.

**4.Неславянскія этнічныя меншасці.**

*Літоўцы*. Балцкія плямёны на тэрыторыі Беларусі. Балта-славянскія ўзаемадзеянні з мяжы III/II тыс.да н.э. – часу рассялення балтаў на беларускіх тэрыяторыях. Этнічныя працэсы ва ўмовах ВКЛ. Кампактныя літоўскія групы на Беларусі. *Яўрэі.* Міграцыі яўрэйскага насельніцтва на Беларусь у Сярэднявеччы. Мяжа яўрэйскай аседласці часоў Імперыі. Асноўныя гаспадарцыя заняткі (рамёствы, гандаль, шынкі і корчмы) і традыцыйна-бытавая культура (яўрэйскія суполкі-кагалы). Грамадскае і рэлігійнае жыццё – газеты, нацыянальная адукацыя, хасіды і яўрэі-артадоксы. *Татары*. Гісторыя першых пасяленняў ХІУ ст. на Беларусі. Традыцыйныя вераванні, звычаі, абрады. Асаблівасці гаспадаркі і матэрыяльнай культуры беларускіх татар. Згуртаванне "Аль-Кітаб" і яго дзейнасць. *Цыганы.* Агульныя звесткі пра цыган, іх паходжанне, этнічная спецыфіка. Вандроўны лад жыцця. Час з'яўлення на тэрыторыі Беларусі (XV ст.). Асаблівасці сацыяльнай арганізацыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

## Раздзел III. Промыслы і рамёствы беларусаў

### Тэма 10. Традыцыйная гаспадарчая дзейнасць і прылады працы

*Пытанні:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Землеробства.
2. Жывёлагадоўля.
3. **3.** Промыслы і рамёствы.

Гаспадарка – аснова жыццядзейнасці этнасу. *Земляробства* як асноўны гаспадарчы занятак беларусаў. Эвалюцыя земляробства. Земляробчыя культуры: збожжавыя, агародныя (гародніна), тэхнічныя, садовыя культуры. Распаўсюджанне культурных раслін у Беларусі. Земляробчыя прылады працы. Тыпы сахі і барон. Цяглавая жывёла. Прылады збору і апрацоўкі ўраджаю. Гаспадарчыя памяшканні. Земляробчыя звычаі і абрады. *Жывёлагадоўля* і яе месца ў адаптацыі беларусаў. Структура жывёлагадоўлі ў Беларусі. Стойлавая гадоўля. Гаспадарчыя пабудовы для ўтрымання жывёлы. Працэс нарыхтоўкі і захавання кармоў. *Падсобныя промыслы і рамёствы*. Размежавальны сэнс паняццяў "промыслы" і "рамёствы". Значэнне промыслаў і рамёстваў як гаспадарчых заняткаў. *Старажытныя здабыўныя промыслы* на тэрыторыі Беларусі: збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, бортніцтва. Спосабы першаснай апрацоўкі, захавання і ўжывання ягад, грыбоў, траў і кветак. Роля рыбалоўства ў гаспадарцы беларусаў. Спосабы захавання рыбы. Маштабы паляўніцтва. Віды дзічыны. Прылады паляўніцтва. Спосабы палявання на буйных і дробных жывёл, на птушак. Бортніцтва як архаічная форма пчалярства. Пасечнае пчалярства. Прадукты пчалярства. *Саматужна-рамесная вытворчасць.* Хатняя вытворчасць і на продаж. Віды рамёстваў: дрэваапрацоўка, металаапрацоўка, ганчарства, гарбарства, ткацтва, пляценне і інш. Народныя мастацкія промыслы. *Беларускі кірмаш.* Месца і час правядзення. Спецыялізаваны і ўніверсальны гандаль. Кірмашовыя забавы.

### Тэма 11. Жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Пытанні:*

1. Тыпы і разнавіднасці традыцыйнага жылля на Беларусі.

2. Сялянскае жыллё.

3. Жыллё гарадскога (пасадскага) насельніцтва.

4. Унутраная планіроўка і аздабленне традыцыйнага жылля.

5.Сядзіба як комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў.

6. Вяночная і пагонная забудова сядзібы, сядзіба з нязвязанымі пабудовамі.

*Літаратура:*

Беларусы. Т.2. Дойлідства. – Мн.: Тэхналогія, 1997. —390 с.

Музей старажытнабеларускай культуры: Дапаможнік для наведвальнікаў/ Пад рэд. В.Ф. Шматава. – Мн.: Беларуская навука, 1998.— С.3 – 120, 200 – 235.

Этническая экология: теория и практика. М., 1991.

**1. Тыпы і разнавіднасці традыцыйнага жылля на Беларусі.**

Арганізацыя жыццёвай прасторы. Сядзіба (двор) і сядзібныя пабудовы. Тыпы сялянскіх сядзіб. Вяночны і пагонны двор. Двор з нязлучанымі пабудовамі. Эвалюцыя сялянскага жылля. Планіроўка сялянскай хаты. Курная хата. Печ без коміна. Унутраны выгляд жылога памяшкання, традыцыйная мэбля (інтэр’ер хаты). Хата з комінам. Змены у інтэр’еры народнага жылля ў канцы XIX – пачатку XX ст. Асаблівасці беларускага народнага дойлідства. Будаўнічыя матэрыялы, інструменты, прыёмы. Будаўнічыя канструкцыі: зрубная, каркасная (слупавая). Фундамент. Дахі, іх формы і канструкцыі. Дэкор у народным дойлідстве. Будаўнічыя звычаі, абрады, павер’і. Выбар месца для жылля, падрыхтоўка будаўнічых матэрыялаў, пачатак і заканчэнне будаўніцтва. Свята ўваходзін. Гаспадарчыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудовы: хлеў, адрына (сянніца, пуня) – сена, салома, гасп.інв., малацілі, павець, свіран (клець) – захоўвання збожжа і прадуктаў, варыўня (істопка), склеп (пограб), гумно (клуня, стадола) – для працяглага захоўвання і апрацоўкі неабмалочанай збажыны ў канцы сядзібнага ўчастка , сушня (асець) для прасушкі пад дахам збажыны, канапель, ільну, азярод – зб. са слупоў для прасушвання на сонцы збажыны і сена. Традыцыйныя вясковыя вытворчыя і бытавыя збудаванні: млыны, кузні, вяндлярні, корчмы, лазні. Малыя формы ў беларускім дойлідстве: агароджы, брамы, студні (калодзежы).

Жыллё (патрэба ў якім – адна з трох асноўных патрэб чалавека) – збудаванне-сховішча ад непагоды і непажаданых небяспечных кантактаў; з’яўляецца, калі людзі пачынаюць жыць аседла. Яго асаблівасці абумоўлены геаграфічным асяроддзем, характарам сацыяльных адносін, тэхналогіямі і культурнымі традыцыямі супольнасці. У этнаграфічнай культуры Беларусі вылучаюць: сялянскае жыллё і жыллё гарадскога (пасадскага) насельніцтва (па тыпах); 1-, 2-, 3-х і шматкамернае жыллё (па разнавіднасцях). Шматкамернае жыллё характэрна для родавай грамады і з’явілася на Беларусі ў эпоху металу. З выдзяленнем нуклеарнай сям’і шматкамерныя пабудовы пачалі змяняцца невялікімі аднакамернымі жытламі для адной пары і яе нашчадкаў. Такое жыллё ўяўляла сабою зрубную пабудову з уваходам у вузкай (тарцовай) сцяне. Яно пераважала ў сярэднявечны і адраджэнскі час. У ХУІІ – пач.ХХ стст. асн. тыпамі сялянскага жылля былі зрубныя 1-, 2-, 3-камерныя пабудовы.

**2. Сялянскае жыллё.**

Аднакамернае жыллё – хата без сянец. Двухкамернае – хата + сенцы (зрубны трысцен ці крытая дошкавая прыбудова да хаты з задняга тарцовага боку). Да ХІХ ст. на Беларусі пераважала 2-камернае жыллё, у 1-камерным жылі найбяднейшыя сяляне. З ХУІ ст. на Беларусі побачз 2-камерным пашыраецца 3-камернае жыллё – хата + сенцы + камора (клець). Камора

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(клецъ) пачала выконваць функцыі жылля – туды пераносілі спальныя месцы, з'явілася печ. Далейшае ўскладненне планіроўкі ішло за кошт унутранай сегментацыі. У сенцах ці варыўні выдзялалася камора, у хаце – спальня, сенцы пераабарудавалі ў кухню і інш. К сярэдзіне XX ст. пачалі будаваць хаты-пяцісценкі, драўляная падлога выціснула земляную, стаў пераважаць мураваны фундамент.

**3. Жыллё гарадскога (пасадскага) насельніцтва.**

Ад з'яўлення гарадоў з IX – XIII стст. асноўным тыпам жылля гарадскога (пасадскага) насельніцтва была квадратная 1-камерная зрубная пабудова плошчай ля 16 м2 з атапленнем па-чорнаму глінабітнай печчу ці каменкай (у Тураве – з плінфы). У XV – XVI стст. беларускія гарады імкліва развіваліся і ў XVII ст. налічваюць 462 гарады (дзе жылі рамеснікі і гандляры) і мястэчкі (дзе жылі і сяляне). На замку (за ўмацаваннямі) жыла шляхта, адміністрацыя і заможныя гараджане, у слабадахі на пасадах – рамеснікі і дробныя гандляры. Тэхніка будавання, матэрыялы і канструкцыя гарадскога жылля паўтарала вясковыя ўзоры,але на больш высокім якасным узроўні, паколькі жыллё тут будавалі прафесійныя арцелі будаўнікоў. Звычайна будаваліся двухзрубныя дамы пад двусхільнай страхой. Дамы заможных гандляроў і рамеснікаў мелі складаную планіроўку, два паверхі, адкрытыя галерэі, вежападобныя ганкі, печы з комінамі, акрамя жылля ўключалі краму ці майстэрню. Пасадскае насельніцтва жыла ў курных хатах з земляной падлогай. З XVIII ст. з'явілася забудова гарадоў танным тыпавым маламетражным жыллём для наёмных супрацоўнікаў мануфактур. Перапланіроўка гарадоў, распачатая ў Расійскай імперыі нарыканцы XVIII ст. забудавала цэнтры гарадоў цаглянымі шматпавярховымі шматкватэрнымі будынкамі і выціснула з цэнтра індывідуальны дом на адну сям'ю. На ўскраінах забудова да пач. XX ст.была пераважна драўляная. У 1914г. з 108 000 гарадскіх будынкаў Беларусі 91 000 была драўляная. З 1920-х гадоў пачалі масава будаваць 1-2-павярховыя тыпавыя стандартныя дамы, 1960-х – тыпавыя жылыя комплексы – мікраараёны для рабочых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**4.Унутраная планіроўка і аздабленне традыцыйнага жылля.**

Аздаблялася жыллё традыцыйным арнаментам трох груп: астральныя матывы, мясцовая флора і фауна, абстрактны геаметрычны арнамент. Аздабляліся аконныя абрамленні, вільчакі. Апошнія рабілі трох тыпаў: падвойныя, вертыкальныя, змешаныя. На Падзвінні і Падняпроўі ў арнаментальнай разьбе пераважжалі геаметрычныя кампазіцыі, на Палессі – разьба ўсіх матываў. Даследчыкі адзначаюць, што пры знешнім афармленні жылля беларусаў канструкцыя арганічна спалучана з дэкорам – кожная дэкаратыўная дэталь уяўляе сабою неабходны элемент канструкцыі хаты.

Унутраная планіроўка традыцыйнага жылля таксама прадуманая і невыпадковая. Печ размяшчалася ў правым ці левым куце пры ўваходзе і вусцем была павёрнута да падоўжнай сцяны з вакном. У процілеглым па дыяганалі ад печы куце была покуць (кут, пакуцце) - пачэснае месца, дзе стаяў стол і была бажніца. Ад покуці ўздоўж сцен ішлі лавы шырынёй ля 50 см. Ад печы ўздоўж глухойсцяны слалі палаці (нары). Пазней з'явіліся драўляныя ложкі, услоны (ля стала і ля ўвахода). На сцяне ля дзвярэй мацавалася палічка для посуду і лыжачнік. Над дзвярыма ці вакном мацавалі паліцу з борцікам для дробных рэчаў. Каштоўныя рэчы і пасаг хавалі ў куфрах (скрынях). З XIX ст. лаву выціснула драўляная канапа, з'явіўся суднік (шафа для посуду). Для надання святочнага настрою інтэр'еру выкарыстоўвалі саматканыя ручнікі, абрусы, посцілкі і дываны.

**5.Сядзіба як комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў.**

Жыллё, гаспадарчыя пабудовы, двор, агарод, сад разам звалі сядзіба (сяліба, аселішча). Сядзіба – індывідуальная гаспадарка селяніна, дзе сканцэнтравана ўсё, што неабходна для жыццезабеспячэння (адаптацыі) яго сям'і: сховішчы зерня, прадуктаў харчавання, лазня, памяшканні для хатняй жывёлы, сховішчы гаспадарчага інвентару і майстэрні. Слова вядома з 15 ст., а шырока распаўсюдзілася з 1557 г., з правядзеннем Валочнай памеры, калі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новыя пасяленні закладваліся на сядзібным (сярэднім) полі. Сядзібныя пляцы размяшчаліся звычайна перпендыкулярна да вуліц і дарог, у валочных пасяленнях – на абодвух баках вуліцы.

Гаспадарчыя пабудовы: хлеў, адрына (сянніца, пуня) – сена, салома, гасп.інв., малацілі, павець, свіран (клець) – захоўвання збожжа і прадуктаў, варыўня (істопка), склеп (пограб), гумно (клуня,стадола) – для працяглага захоўвання і апрацоўкі неабмалочанай збажыны ў канцы сядзібнага ўчастка, сушня (асець) для прасушкі пад дахам збажыны, канапель, ільну, азярод – зб. са слупоў для прасушвання на сонцы збажыны і сена. Традыцыйныя вясковыя вытворчыя і бытавыя збудаванні: млыны, кузні, вяндлярні, корчмы, лазні. Малыя формы ў беларускім дойлідстве: агароджы, брамы, студні (калодзежы).

З сярэдзіны XX ст., калі многія віды гаспадарчай дзейнасці пераносіліся на вытворчыя пляцоўкі грамадскай гаспадаркі (у калгасы), неабходнасць у шматлікіх гаспадарчых пабудовах у кожнай дробнатаварнай індывідуальнай гаспадарцы істотна паменшыла. Пачаўся працэс перапланіроўкі традыцыйнай сядзібы, знікнення яе “класічных” тыпаў. Найбольш характэрнымі тыпамі беларускай этнаграфічнай сядзібы лічаць вяночны двор і пагонны двор. Асобна называюць больш пазнейшы па паходжанні двор з нязвязанымі пабудовамі.

**6. Вяночная і пагонная забудова сядзібы, сядзіба з нязвязанымі пабудовамі.**

Пры вяночнай забудове комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў уяўляў квадрат або простакутнік, усе пабудовы ў якім звязаны паміжсобку. Прамежкі паміж пабудовамі закрывалі замётамі – парканамі з бярвён. Звычайна тарцом да вуліцы ў лінію ставілі хату, сенцы, варыўню ці камору, хлеў (з асобным уваходам са двара). Паралельна ставілі шчыльна адно да аднаго іншыя хлявы і свіран (клець), уваход у які быў насупраць вакон хаты. Такое кампактнаязабудова бараніла сялянскуюсям’ю ад ліхіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

людзей, а скаціну – ад драпежнікаў. У 19-пач.20 стст. вяночная забудова на Ўсходзе Беларусі (Падняпроўе, Усх.Палессе, Падзвінне), радзей у Цэнтральнай Беларусі і толькі спарадычна – на Панямонні і Зах.Палессі.

**Тэма 12. Традыцыйны тэкстыль і адзенне беларусаў**

*Пытанні:*

1. Прадзенне і ткацтва.
2. Развіцце ткацтва на Беларусі.
3. Агульная характарыстыка адзення беларусаў.

*Літаратура:*

Беларусы. Т.1. Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мінск, 1995.

Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. Мн.: .: Навука і тэхніка, 1981. – 119 с.

Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / [Т. А. Навагродскі і інш.] Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2009. – 335 с.

**1. Прадзенне іткацтва**

З'яўленне тэкстылю ў неаліце. Тэхніка прадзення. Хатняе ткацтва. Жаночы характар ткацкага рамяства.Віды ткацтва. Віды тканых вырабаў у беларусаў.

**2. Агульная характарыстыка адзення беларусаў.**

Адзенне як частка матэрыяльнай культуры этнасу. Функцыі адзення: утылітарна-практычная, эстэтычная, абрадавая, ідэнтыфікацыйная (вызначэнне прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай, этнічнай, рэлігійнай групы). Мужчынскае і жаночае адзенне. Паўсядзённае і святочнае адзенне. Абрадавае адзенне. Матэрыялы. Колеравая гама. Спосабы ўпрыгожвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гістарычная эвалюцыя беларускага народнага адзення. Комплекс мужчынскага адзення: нацельнае адзенне, верхняе адзенне, абутак, галаўныя ўборы. Дэкор мужчынскага касцюму. Комплекс жаночага адзення: кашуля, паяснoе адзенне, безрукаўка (гарсэт), галаўныя ўборы, абутак, верхняя вопратка. Асноўныя віды крою кашуль. Аздабленне жаночага касцюму. Асаблівасці дзіцячага і юнацкага адзення. Шляхецкае адзенне. Гарадскі касцюм другой паловы XIX – пачатку XX ст. і яго ўплыў на традыцыйнае сялянскае адзенне.

**Тэма 13. Традыцыйныя кераміка Беларусі**

*Пытанні:*

1. Агульная характарыстыка рамяства. Гісторыя ганчарства ў Беларусі
2. Матэрыял і тэхніка рамяства. Віды ганчарнага посуду

*Літаратура:*


Беларусы. Т.1. Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мінск, 1995.

Милюченков, С.А. Белорусское народное гончарство / М.А. Мілючэнкаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 183 с.

Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / [Т. А. Навагродскі і інш.] Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2009. – 335 с.


**1. Агульная характарыстыка рамяства. Гісторыя ганчарства ў Беларусі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З'яўленне тэхналогій вырабу керамікі на беларускіх тэрыторыях у неалітычныя часы. Археалагічныя культуры штрыхаванай керамікі, лейкападобных кубкаў. Ганчарства на Беларусі. Этнаграфічныя рэгіёны Беларусі і варыятыўнасць яе керамікі. Кераміка гартаваная, абварная, распісная, васкаваная, дымлёная і паліваная. Керамічны посуд і керамічныя побытавыя рэчы. Кераміка ў этнакультурным выхаванні. Керамічныя музычныя інструменты, керамічныя цацкі.

Ганчарства, вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з гліны, вядома на Беларусі з часоў неаліту. Як спецыялізаванае рамяство вылучылася са з'яўленнем ганчарнага круга (на Беларусі ў Хст.). Першапачаткова вырабы ляпілі  ад рукі і не абпалівалі. Асноўным кампанентам фармовачнай масы з'яўлялася гліна, у якую для павелічэння трываласці дадавалі сухую траву, жарству, пясок. З XIX ст.фармовачную масу рабілі з аднаго або двух-трох гатункаў гліны шляхам працяглай пластычнай апрацоўкі (нагамі, рукамі, доўбняй). Падрыхтаваную масу дзялілі на невялікія кавалкі, дастатковыя для вырабу адной пасудзіны (камякі, галкі, клёцы). Фармавалі посуд на нажным або ручным ганчарным крузе спосабам выціскання, кальцавога налепу ці выцягвання. Пасля посуд абпальвалі для атрымання большай трываласці ў ганчарным горне (зрэдку ў хатняй печы).

Ганчарства было надзвычай развіта ў гарадах сярэднявечнай Беларусі. У XVI-XVIII ст.ст. цэхі, у якія ўваходзілі ганчары, існавалі ў Полацку, Віцебску, Дзісне, Мінску, Гродне, Слуцку, Міры і інш.гарадах і мястэчках. Аднак, у друг.пал.XIXс ст.гарадское ганчарства было ўжо не ў стане канкураваць з прамысловай вытворчасцю і пастулова занепадае. Іншыя працэсы адбываліся ў сельскім ганчарстве. Адмена прыгоннага права, развіццё капіталістычных адносінаў станоўча паўплывалі на народныя рамёствы. Паколькі прамысловыя вырабы былі маладаступныя сялянству, то вялікім попытам карыстаўся танны ганчарны посуд вясковых (местачковых) ганчароў. Росту рамяства садзейнічала таксама і малазямелле значнай часткі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сялянства. Таму ў многіх месцах Беларусі, дзе меліся багатыя радовішчы добрай гліны, утварыліся буйныя ганчарныя асяродкі, якія аб'ядноўвалі некалькі суседніх вёсак і па колькасці майстроў нашмат апераджалі старажытныя ганчарныя цэнтры. З найбольш буйных канцэнтрацый ганчарных паселішчаў можна назваць Сіняўку, Ганявічы, Масцілавічы, Забалотнікі (Клецкі р-н), Ясенец, Літвінавічы (Шклоўскі р-н). Колькасць ганчароў дасягала тут некалькі сотняў. Усяго ў к.XIX-пач.XX ст. ганчарствам на Беларусі займалася каля 4-4,5 тыс.чалавек.

## 2. Матэрыял і тэхніка рамяства. Віды ганчарнага посуду

Надзвычай шырокім і разнастайным быў асартымент ганчарных вырабаў, якія можна падзяліць на некалькі асноўных катэгорый.

1. Посуд для гатавання

- Гаршкі
- Бабачнікі (гліняныя пасудзіны ў выглядзе ўсечанага конуса з вертыкальнымі глыбокімі ўмяцінамі па баках для выпякання велікоднага пірага)
- Латкі (глыбокія гліняныя пасудзіны з шырокім тулавам і вусцем, у якіх смажылі і тушылі мяса, бульбу, пражылі гарох і да т.п.)
- Рынкі (круглая, плоская пасудзіна на трох ножках з полым дзяржальнам, прызначаная для смажання страў)

2. Посуд для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў

- Збаны (пасудзіны з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі і звужаным горлам, прыназначаныя для захоўвання малака)
- Гарлачы (падобныя на збаны, але без ручкі і дзюбкі)
- Глякі (шарападобныя пасудзіны з плоскім дном, кароткім вузкім горлам і 1-2 ручкамі для захоўвання і транспарціроўкі вадкіх рэчываў – алею, квасу і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Слаі (высокія пасудзіны з пукатымі бакамі і шырокім горлам; у вялікіх слаях салілі агуркі, грыбы, капусту, у малых – захоўвалі мёд, тлушч, смятану і інш.)
- Спарышы (пасудзіна з 2-3 гаршчкоў, змацаваных адной ручкай; прыназначалася для дастаўкі ежы на поле ў сенакос ці жніво)

3. Сталовы посуд: міскі, паўміскі, кубкі, хлебніцы, маслёнкі і інш.
4. Рэчы гаспадарчага ўжытку: рукамыі, паілкі, пасудзіны для гонкі дзёгцю і да т.п.
5. Дэкаратыўная кераміка: фігурны посуд, скульптуры малых форм у выглядзе жывёл, букетнікі, вазоны.
6. Цацкі ў выглядзе фігурак людзей, жывёл, птушак.

Самастойнае значэнне мела вытворчасць дахоўкі (керамічнай пліткі для накрыцця дахаў пераважна мураваных будынкаў) і кафлі (керамічныя пліткі для абліцоўкі і дэкаратыўнага аздаблення печаў, камінаў і інш.).

У беларускай традыцыйнай культуры з ганчарствам і ўласна гліняным посудам было звязана шмат архаічных уяўленняў і забабонаў. Да прыкладу, лічылася, што калі благое вока гляне на посуд пад час лепкі, то гаршкі ў печы паб’е пярун. З мэтай абароны посуд трэба было пакрапіць салёнай вадой ці абвесці вакол тры разы падпаленай драўлянай качаргой. На Палессі гаршчок, таемна скрадзены ў ганчара і ўкінуты ў калодзеж, лічыўся надзейным сродкам выклікання дажджу ў часе працяглай засухі. Сувязь гаршчка з душамі продкаў і хатнім ачагом выразна прасочваецца ў агульнабеларускім павер’і аб тым, што дамавік перасяляецца ў новую хату менавіта ў гаршчку з жарам.

У наш час маштабы народнага ганчарнага промыслу з’яўляюцца мінімальнымі, аднак у сувязі з ростам цікавасці да традыцыйнай спадчыны назіраецца пэўнае адраджэнне мастацка-дэкаратыўных форм архаічнага рамяства.

## Тэма 14. Традыцыі апрацоўкі дрэва на Беларусі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Пытанн:*

1. Тыпы і эвалюцыя апрацоўкі дрэва.
2. Дрэваапрацоўчыя рамёствы Беларусі.
3. Геаграфічная спецыялізацыя дрэваапрацоўчых рамёстваў Беларусі.
4. Рэвіталізацыя старжытных тэхнік апрацоўкі дрэва.

*Літаратура:*

Беларусы. Т.1. Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мінск, 1995.

Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць. З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В.А. Лабачэўская. – Мінск, 1998.

Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ / [Т. А. Навагродскі і інш.] Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2009. – 335 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**1. Тыпы і эвалюцыя апрацоўкі дрэва.**

Да асноўных тыпаў апрацоўцы дрэва адносяцца: цяслярства, сталярства, бондарства, стальмашнае рамяство, такарнае рамяство, разьба па дрэве, пляценне. На беларускіх тэрыторыях, як і паўсюль ва Ўсходняй Еўропе, дрэва заўсёды было ў традыцыйнай культуры адным з найванейшых матэрыялаў для вырабу прадметаў ужытку, разнастайных працоўных прылад, зброі. Найстаражытныя тыпы апрацоўкі дрэва ўзніклі ў палеаліце са з’яўленнем вырабу прыладаў працы. У эпоху металу са з’яўленнем металічных прылад узніклі цяслярства, сталярства, выраб посуду. У Сярэднявеччы паглыбілася вытворчая спецыялізацыя дрэваапрацоўшчыкаў.

Вытворчая спецыялізацыя тыпаў апрацоўцы дрэва ў Сярэднявеччы

| Тыпы апрацоўцы дрэва | | |
|---|---|---|
| Цяслярская справа | Сталярная справа | Стальмашнае рамяство |
| вытворчая спецыялізацыя | | |
| Выраб дахавых матэрыялаў, Будаўніцтва мастоў, Будаўніцтва фартыфікацый | Выраб акон і дзвярэй, Выраб мэблі, Выраб с/г прылад | Вытворчасць вазоў, Вытворчасць карэт, Колава, саннае, дужнае рамяство |

Напрацягу ўдасканалення тэхналогій з Сярэднявечча да XX ст. тыпы і спецыялізаваныя адгалінаванні дрэваапрацоўкі развіваліся і паляпшаліся.

**2. Дрэваапрацоўчыя рамёствы Беларусі**.

У XYII ст.на Беларусі налічвалася каля 30 рамесных дрэваапрацоўчых прафесій.

У гарадах існавалі карпаратыўныя аб’яднанні дрэваапрацоўшчыкаў у выглядзе братстваў ці цэхаў (бондараў, разьбяроў, карэтнікаў і г.д.). Частка рамеснікаў несла службы пры замках, кляштарах, фальварках, гасцініцах і жыла асобнымі дварамі ці слабадамі. Найбольш буйныя майстры трымалі супрацоўнікаў пры майстэрнях і вучняў. Некаторыя вызваляліся ад пастаяннай службы і плацілі панам і клірыкам чынш.

Разьба па дрэве была адным з найбольш запатрабаваных рамёстваў у культавым і палацавым дойлідстве сярэднявечнай і адраджэнскай Беларусі, беларускім барока і класіцызме. Мастацтвазнаўцы выдзяляюць у ёй яе традыцыйны аспект, сувязі з вясковым мастацтвам.

Шырока выраблялiся драўляныя транспартныя сродкі для транспартыроўцы па сушы (карэты, брычкі, вазы) і па вадзе (лодкі, чоўны, драўляныя паромы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сельскай мясцовасці дрэваапрацоўка была дапаможным заняткам у гаспадарцы. Вясковая сям’я сама будавала жыллё, вырабляла прылады працы, посуд, мэблю, транспартныя сродкі, пляла лапці, кошыкі і г.д. Майстэрняў на вёсцы звычайна не было – у кожнай сям’і пад паветкай стаяў варштат (кросны), знаходзіліся вытворчыя прыстасаванні і інструменты. Частка вырабаў збывалася на мясцовых кірмашах.

У капіталістычны перыяд дрэваапрацоўчая справа набыла выгляд адходных промыслаў. Многія гарадскія і вясковыя цесляры, сталяры хадзілі ў заробкі ў аддаленыя мясціны.

**3. Геаграфічная спецыялізацыя дрэваапрацоўчых рамёстваў Беларусі.**

У XX ст. на Падзвінні і Падняпроўі сярод рамеснікаў панавалі цесляры. На Падняпроўі таксама моцна былі развіты сталярны промысел і вытворчасць дахаў (асабліва з гонту). На Случчыне і Нясвіжчыне была моцна развіта драўлянае дойлідства і мела месца вялікая колькасць рамеснікаў-дрэвабудаўнікоў. У Цэнтральнай Беларусі шмат рамеснікаў займалася апрацоўкай ліпавай кары і пляценнем. У Рагачоўскім павеце вельмі якасна выраблялі рагожы. Пляценне з лубу і лазы вядома на Піншчыне, мазыршчыне і ў Налібокскім краі.

Нарыхтоўкай і тралёўкай лесу, лесасплавам займалася вялікая частка насельніцтва басейнаў Дняпра, Бярэзіны, Прыпяці, Зах.Дзвіны і Нёмана.

**4. Рэвіталізацыя старжытных тэхнік апрацоўкі дрэва.**

За савецкім часам многія дрэваапрацоўшчыкі аб’ядноўваліся ў арцелі, якія паступова ператвараліся ў вытворчыя прадпрыемствы, асабліва ў мэблевыя. Напрыканцы XX ст.большасць дрэваапрацоўчых рамёстваў ператварыліся ў індывідуальна-прадпрымальніцкую дейнасць і дапаможны промысел.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На мяжы XX-XXI ст. даследчыкі народнай культуры ініцыіравалі адраджэнне вырабу з дрэва традыцыйных музычных інструментаў: дудак, парных дудак, гудка і скрыпкі, гусляў, колавай ліры, драўляных частак дуды, цымбал. Можна сцвярджаць, што паступова адбываецца рэвіталізацыя старжытных тэхнік апрацоўкі дрэва ў дэкаратыўна-ўжытковых мэтах.

### Тэма 15. Традыцыі апрацоўкі металу на Беларусі

*Пытанні:*

1. Агульная характарыстыка рамяства
2. Гісторыя развіцця кавальства на Беларусі
3. Асартымент вырабаў
4. Сучасны стан рамяства

*Літаратура:*


Беларусы. Т.1. Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мінск, 1995.

Сахута, Я.М. Беларускае народнае мастацкае кавальства / Я.М. Сахута. – Мн.: Полымя, 1990. -190 с.

Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / [Т. А. Навагродскі і інш.] Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2009. – 335 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 1. Агульная характарыстыка рамяства

Індаеўрапейскія вытокі апрацоўкі металу і кавальства. Першыя вырабы з металу – медныя і бронзавыя амулеты і ўпрыгожванні балтыйскіх плямён на тэрыторыі Беларусі. Выраб з металу прыладаў працы і зброі ў Эпоху бронзы, антычныя часы і ў Сярэднявеччы. Вобраз каваля ў беларускім фальклоры. Каваныя прылады працы ў сельскай гаспадарцы, хатнім побыце і

ў эстэтычным аздабленні жылля. Каваныя крыжы Беларусі ў культавым дойлідстве і абрадавай культуры яе вясковых асяродкаў.

## 2. Гісторыя развіцця кавальства на Беларусі

Кавальства – вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза шляхам яго гарачага кавання. Адрозніваюць ад слясарства, дзе пераважаюць работы з халодным металлам. Аднак, у народным (вясковым) кавальстве такога падзелу не існавала – кавалі выконвалі любыя работы па апрацоўцы метала.

На Беларусі кавальства вядома з часоў жалезнага веку і было заснавана на выплаўцы крычнага жалеза з мясцовых балотных руд і выкоўванні з яго вырабаў гаспадарчага і ваеннага прыназначэння. У Сярэдневеччы кавальствам пераважна займаліся гарадскія рамеснікі, якія валодалі складанымі тэхналогіямі загартоўкі, цэментацыі і зваркі жалеза. У XVI-XVII ст.ст. існавалі шматлікія кавальскія цэхі (Полацк, Віцебск, Магілёў, Слуцк і інш.), якія аб'ядноўвалі кавалёў розных спецыяльнасцяў: нажоўшчыкаў, мечнікаў, замочнікаў, кацельшчыкаў і інш. У XIX ст. з развіццём прамысловасці кавальства ў гарадах заняпала, адначасова ўзрасла яго роля ў вёсцы, дзе яно задавальняла бытавыя і гаспадарчыя патрэбы мясцовага насельніцтва.

## 3. Асартымент вырабаў

З жалеза выконвалі рэчы гаспадарчага і бытавога прызначэння. У кузнях выконвалі такія віды работ, як коўка дэталяў транспартных сродкаў (калёс, санак, вазкоў, брычак), выраб сельскагаспадарчага інвентару (сярпоў, сашнікоў, матык), слясарнага і сталярнага інструменту (сякер), прылад хатняга ўжытку (секачоў, крукоў, віл), прыстасаванняў для пабудовы і аснашчэння жылля (завесаў, клямак, замкоў) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У традыцыйным беларускім грамадстве кавальскае рамяство, як правіла, з’яўлялася спадчынным. Сыны пераймалі навуку ў бацькі ці бліжэйшых родзічаў.

Кузні былі ў многіх вёсках, у Гарадку Віцебскай вобл. ў 1898 г. было 12 кавалёў, 6 рабочых і 7 вучняў.

Слова каваль паходзіць ад дзеяслова каваць, які ёсьць у славянскіх, балцкіх і нават лацінскай ды ірляндзкай мовах. Кавальства, кавальня, кавадла, падкаваць, падкова — словы аднаго гнязда. „Сам гартаваны, як меч на кавалдзе паходнай“ — пісаў пра Вітаўта Вялікага Мікола Гусоўскі.

Праца каваля ў вясковай грамадзе лічылася пачэснай і ганаровай, была ахутана мноствам таямніц. Каваль — адна з самых таямнічых, спавітых легендамі, казкамі й забабонамі асобаў. Каваль быў чарадзеем, чалавекам, які вырабляе з агнём і жалезам тое, што ня можа зрабіць хто заўгодна. У народных вераваннях і фальклоры каваль, як чалавек, што працуе са стыхіяй агню і жалезам, нярэдка выступае ў якасці моцнага знахара, казачнага героя-асілка, які супрацьстаіць “нячыстай сіле” (чорту, цмоку, ведзьме) і перамагае яе.

“Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывенька,
Кабылка сьляпенька.
Зачапіліся за пень,
Прастаялі цэлы дзень.
Нашыя кавалі
Лепшыя па ўсёй зямлі”.

Гэта дзіцячая папеўка пра каваля. Такіх папевак дзясяткі. Кавальства было самым паважаным і запатрабаваным рамяством у беларускай вёсцы. Дзяўчаты марылі выйсьці замуж за кавалёў. Гэтыя майстры лічыліся індывідуалістамі й заможнікамі. Таму ў ліку першых іх раскулачвалі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ссылалі ў часе калектывізацыі... Пазьней яны ўжо не змаглі ўвайсьці ў ранейшую сілу. Цяпер у бальшыні вёсак сваіх кавалёў няма.

Вясковую кузню, з меркаванняў пажарнай бяспекі, ставілі воддаль ад будынкаў, у канцы сядзібы, бліжэй да вады. Для грамадскіх кузняў лепшым месцам з'яўлялася скрыжаванне дарог ці паблізу карчмы – там, дзе быў найбольшы рух падарожных людзей. Кузня ўяўляла сабой просты будынак квадратнай ці простакутнай формы, без столі з земляной падлогай. Каля тарцовай сцяны, насупраць уваходу, узводзілі горан – кавальскую печ для награвання металу, забяспечаную мяхамі і паддувалам. Над горнам рабілі каптур для выцяжкі дыму.

Вуглі ствараюць тэмпэратуру 2 тысячы градусаў. І жалеза разаграваецца да 1300 – 1400 градусаў. Калі мэтал награваецца да белага напалу, ён робіцца мяккі, падатлівы, як плястылін.

Паблізу горна, пасярэдзіны кузні (для зручнасці працы з любога боку), усталёўвалі кавадла – масіўны металічны куб з адным ці двума рагамі. Побач ставілася драўлянае карыта з вадой – ахалоджваць загатоўкі. Пры сцяне пад акном мацавалі варштат – драўляны насціл, на якім выконвалі розныя работы, не звязаныя з кавальствам, трымалі інструмент. Абавязковым кавальскім інвентаром былі малаткі і клешчы, а таксама разнастайныя зубілы, прабойнікі і г.д.

У залежнасці ад функцыянальнага і практычнага прызначэння, кавальскія вырабы можна падзяліць на некалькі груп.

1. Падкоўванне коней. Адзін з найбольш пашыраных і запатрабаваных у побыце працэсаў, які ўключаў выраб падкоў, вухналёў (цвікоў) і непасрэдна падкоўванне коней.

2. Кавальства ў народным дойлідстве: клямкі, завесы, крукі, зашчэпкі, замкі, крыжы на купалы цэркваў. Сюды ж можна аднесці і блізкія па характары надмагільныя крыжы і агароджы.

3. Акоўка транспартных сродкаў – калёс, саней, брычак, вазоў. Для іх выраблялі восі, шворны, атосы, шыны, падкосы, рэхвы і да т.п.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Кавальскія вырабы ў народным побыце. Сюды ўваходзяць шырокі дыяпазон рэчаў самага рознага прызначэння: кавальскія, слясарскія, цяслярскія інструменты; сельскагаспадарчы інвентар – плугі, бароны, сярпы, косы, матыкі і інш.; вырабы бытавога прызначэння – секачы, кавені (качэргі), рагачы (вілкі), крэсівы, бязмены і да т.п.

**4. Сучасны стан рамяства.**

У наш час кавальства прыкметна змяніла свой характар. Сфера яго прымянення ў народным побыце моцна звузілася, саступіўшы месца вырабам прамысловай вытворчасці. Сваё выкарыстанне кавальства знайшло ў рэстаўрацыйнай справе, дзе носіць пераважна мастацкі характар.

Майстры спрабавалі стварыць Саюз беларускіх кавалёў Гэта была любімая ідэя каваля Аляксандра Дубіны з Глыбокага. Аднак спадар Аляксандар рана пайшоў з жыцьця. І пры яго жыцьці глыбоцкія ўлады не змаглі знайсьці памяшканьня пад Цэнтар кавальскага мастацтва. Была спроба стварыць такі цэнтар у Менску – з майстэрнямі, з горнамі, з багатым варштатам, з майстар-клясамі й турыстычнай праграмай. Ідэя захрасла, бо няма мэцэнатаў і няма дзяржаўнай праграмы падтрымкі кавальства.

